СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 5.42, 20.45, 15.03;
Віцебск — 5.28, 20.40, 15.12;
Магілёў — 5.32, 20.35, 15.03;
Гомель — 5.36, 20.25, 14.49;
Гродна — 6.00, 20.58, 14.58;
Брэст — 6.04, 20.55, 14.51.

МЕСЯЦ:
Поўня 13 жніўня.

ІМЯНІНЫ:
Еўдакіма, Юліты; Дзіяны, Іпаліта

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

13 ЖНІЎНЯ 1992 г.
чацвер, № 160 (21938)

РОЗГАЛАС

ХЛЕБ ДЛЯ РЭСПУБЛІКІ

Першы батальён накіраваны ў Кустанайскую вобласць для аказання Казахстану дапамогі ва ўборцы збожжа. Недалёкі і той дзень, калі на цаліну накіруецца другі батальён.

Такім чынам, уступіла ў дзеянне пагадненне, заключанае паміж Беларуссю і Казахстанам, які абавязаўся прадаць нашай рэспубліцы 2 мільёны тон збожжа па 10 тысяч рублёў за тону. Са свайго боку Беларусь выконвае абавязацельствы ў дапамозе людзьмі і тэхнікай.

Аляксандр МАКАРАЎ.

ТЭЛЕГРАМЫ Ў НУМАР

Сардэчна віншую супрацоўнікаў рэдакцыі, аўтарскі актыў і чытачоў «Звязды» з 75-годдзем з дня выхаду першага нумара газеты. Жадаю слыннаму калектыву старэйшай нацыянальнай газеты і надалей плённа працаваць на ніве адраджэння нашай Бацькаўшчыны, годна прапагандаваць і абараняць роднае слова. Новых вам творчых поспехаў і набыткаў!

Міністр інфармацыі Анатоль БУТЭВІЧ.

***

Сардэчна віншуем калектыў нашай любімай газеты з 75-годдзем. Жадаем вашаму выданню надалей заставацца такім жа папулярным, інфармацыйна насычаным, аб'ектыўным. Спадзяёмся, заўсёды будзем знаёміцца на старонках вашай газеты з матэрыяламі, якія адлюстроўваюць пытанні беларускай гісторыі.

Ад імя архівістаў Беларусі — начальнік Галоўархіва Аляксандр МІХАЛЬЧАНКА.

ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ВЕСНІК

12 жніўня ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Сінгапур шляхам абмену нотамі паміж міністэрствамі замежных спраў дзвюх дзяржаў.

Колькасць дзяржаў, з якімі Беларусь цяпер мае дыпламатычныя адносіны, дасягнула такім чынам 58.

МЗС Беларусі.

Вячаслаў КУЗНЯЦОЎ:

«БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў РАСШЫРЭННІ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Аб перспектывах умацавання і развіцця эканамічнага супрацоўніцтва ішла размова на сустрэчы першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Вячаслава Кузняцова з прэзідэнтам турэцкай фірмы «Энка», якая ўдзельнічае ў будаўніцтве жылля ў Слоніме для ваеннаслужачых, што выводзяцца з Германіі, Шарыкам Тара і ўладальнікам буйнейшай у Турцыі прамыслова-гандлёвай групы «Коч» Вехбі Кочам.

Група «Коч» выпускае аўтамабілі, электраабсталяванне, вырабляе тэкстыль, тавары працяглага карыстання, мае буйныя фінансавыя ўкладанні ў гандлёвы і турысцкі бізнес. Яе гадавы абарот — 9 мільярдаў долараў. Эксперты гэтай фірмы маюць намер дэталёва вывучыць сітуацыю ў Беларусі з мэтай арганізацыі ўзаемавыгаднага для абедзвюх дзяржаў супрацоўніцтва. Як заявіў Вехбі Коч, ён лічыць, што Беларусь — найбольш стабільная дзяржава СНД і самы надзейны эканамічны партнёр Садружнасці.

Прэзідэнт «Энкі», якая ў гэтым годзе заканчвае будаўніцтва і здае «пад ключ» жылы комплекс на 1.455 кватэр з усёй неабходнай інфраструктурай агульным коштам больш за 200 мільёнаў нямецкіх марак, выказаў сваё глыбокае задавальненне такім супрацоўніцтвам, якасцю і тэмпамі работы беларускіх партнёраў-будаўнікоў.

Зацікаўленасць беларускага боку ў расшырэнні супрацоўніцтва пацвердзіў Вячаслаў Кузняцоў. Ён адзначыў, што ў рэспубліцы прыняты неабходныя законы для развіцця знешнеэканамічнай дзейнасці. Яны сарыентаваны на стварэнне льготных умоў для прадпрымальнікаў, якія вырабляюць прадукцыю, што цікавіць жыхароў рэспублікі. І ў параўнанні з аналагічнымі законамі іншых краін СНД у Беларусі для замежных інвестараў гэтыя ўмовы найбольш выгадныя. Магчымасці для замежных інвестараў у рэспубліцы практычна не абмежаваны, падкрэсліў Вячаслаў Кузняцоў.

А. КРЫЖАНОЎСКІ. (БЕЛІНФАРМ).

Конь здаўна лічыўся самай прыгожай жывёлінай. І нельга было ўявіць без яго вёску. Але ў часы «развітога сацыялізму» мы ледзь не знішчылі гэтых прыгажуноў.

Цяпер жа без каня ў вёсцы нам не выжыць, так лічыць старшыня калгаса «Палітаддзелец» Лепельскага раёна Іван Міхайлавіч Пазняк. І ў гаспадарцы завялі 93 коней. Аб карысці гэтых жывёлін гаварыць не прыходзіцца, тут лічаць: што карысна, тое і выгадна, і таму трымаюць такі вялікі статак.

Алесь КУШНЕР.

НА ЗДЫМКАХ: калгасны конюх Леанід Рыгоравіч ЖАРНАСЕК; коні-прыгажуны.

І зноў — жыццё ў крэдыт?

Пазаўчора ў міністра фінансаў рэспублікі С. Янчука, з удзелам першага намесніка старшыні Нацыянальнага банка Беларусі М. Кузьміча, адбылася прэс-канферэнцыя для журналістаў, прысвечаная пытанням плацяжоў, узаемаразлікаў паміж прадпрыемствамі. Пры гэтым асноўная гутарка ішла аб узаемаразліках паміж прадпрыемствамі Расіі і Беларусі і аб адпаведным, заключаным нядаўна паміж банкамі абедзвюх рэспублік пагадненні. Наша газета пісала ўжо на гэтую тэму (гл. учарашні нумар), абмяжуемся некаторымі дэталямі.

Нагадаю спачатку: неплацяжы прадпрыемстваў, якія дасягнулі свайго апагею ў чэрвені, амаль дабілі нашу эканоміку. Неабавязковасць партнёраў унутры рэспублікі, а найбольш — з бліжэйшага замежжа стала проста надзвычайнай. Паставіць прадукцыю і атрымаць у адказ вялікі кукіш — гэтага можна было чакаць амаль на кожным кроку. Зрэшты, варта яшчэ раз адзначыць, што нярэдка існавалі аб'ектыўныя прычыны неплацяжоў, а галоўная з іх, на наш погляд, таілася ў раз'яднанасці фінансавых структур, што дзейнічаюць у так званай адзінай рублёвай зоне, няўзгодненасць і нават супярэчлівасць у дзеяннях банкаў, якія скарыстоўвалі смутны момант і найперш імкнуліся напампаваць у сваю эканоміку крэдытную эмісію. Вядома, за кошт іншых. Пры такой сітуацыі разбураліся і без таго нетрывалыя эканамічныя сувязі. Атрымаў развіццё «мяшочны» метад аплаты за прадукцыю, г. зн. грошы — адразу ж на бочку, толькі наяўнымі. Пры такой сітуацыі не было чаго і думаць пра ўздым эканомікі. Сітуацыя была ўпушчана з самага пачатку, калі першага ж банкрута патрабавалася аб'явіць банкрутам. І зрабіць усё адпаведнае адносна яго, як робіцца ў іншых краінах.

Аднак што канкрэтна прагучала на прэс-канферэнцыі? Найперш — адносна разлікаў паміж прадпрыемствамі ў рэспубліцы. Паміж імі быў зроблены ўзаемазалік, тым, каму не хапіла сродкаў, выдзелілі крэдыты. Па традыцыі. Прычым крэдытаў набралася на вельмі і вельмі круглую суму. Спакойна, грамадзяне, — міністр фінансаў назваў 56 мільярдаў рублёў. Прычым частку працэнтаў за карыстанне крэдытамі павінен аплаціць бюджэт. (Нялішне засвоіць, хто яшчэ не засвоіў: ягo напаўняем усе мы разам). Дарэчы, міністру было зададзена пытанне: а як наконт вяртання крэдытаў? Ці ўсё будзе, як «да таго», г. зн. спішуцца? Міністр адразу катэгарычна запярэчыў наконт спісання, а потым падумаў і ўдакладніў, што, магчыма, часткова і спішуцца. І, думаецца, вельмі правільна зрабіў, калі не настойваў на першапачатковым выказванні, а падумаў.

Яшчэ на прэс-канферэнцыі адзначалася, што для нас бліжэй крэдытная палітыка новага галоўнага банкіра Расіі Герашчанкі, які змяніў нядаўна Мацюхіна (нагадаю: Герашчанка раней узначальваў Дзяржбанк СССР). Ён таксама збіраецца зрабіць шырокамаштабную фінансавую «падпітку» прадпрыемстваў Расіі. Вядома, калі мець на ўвазе інтарэсы Беларусі, то нашым прадпрыемствам лягчэй будзе пасля гэтага патрыбушыць сваіх расійскіх даўжнікоў, але будзем улічваць і нярадасную перспектыву непазбежнага ўзлёту пасля гэтага інфляцыі, якая тут жа ператворыць атрыманыя грошы ў пустыя паперкі. Напампоўванне грошай у эканоміку хапіла сродкаў, выдзелілі крэдыты. Па традыцыі. Прычым крэдытаў набралася на вельмі і вельмі круглую суму. Спакойна, грамадзяне, — міністр фінансаў назваў 56 мільярдаў рублёў. Прычым частку працэнтаў за карыстанне крэдытамі павінен аплаціць бюджэт. (Нялішне засвоіць, хто яшчэ не засвоіў: ягo напаўняем усе мы разам). Дарэчы, міністру было зададзена пытанне: а як наконт вяртання крэдытаў? Ці ўсё будзе, як «да таго», г. зн. спішуцца? Міністр адразу катэгарычна запярэчыў наконт спісання, а потым падумаў і ўдакладніў, што, магчыма, часткова і спішуцца. І, думаецца, вельмі правільна зрабіў, калі не настойваў на першапачатковым выказванні, а падумаў.

Яшчэ на прэс-канферэнцыі адзначалася, што для нас бліжэй крэдытная палітыка новага галоўнага банкіра Расіі Герашчанкі, які змяніў нядаўна Мацюхіна (нагадаю: Герашчанка раней узначальваў Дзяржбанк СССР). Ён таксама збіраецца зрабіць шырокамаштабную фінансавую «падпітку» прадпрыемстваў Расіі. Вядома, калі мець на ўвазе інтарэсы Беларусі, то нашым прадпрыемствам лягчэй будзе пасля гэтага патрыбушыць сваіх расійскіх даўжнікоў, але будзем улічваць і нярадасную перспектыву непазбежнага ўзлёту пасля гэтага інфляцыі, якая тут жа ператворыць атрыманыя грошы ў пустыя паперкі. Напампоўванне грошай у эканоміку

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ФАДЫЁ ФАКТ

Падпісаны загад міністра абароны Рэспублікі Беларусь аб забароне дзейнасці палітычных партый, грамадска-палітычных рухаў ва Узброеных Сілах. Забаронены таксама ўдзел ваеннаслужачых у рабоце палітычна арыентаваных структур у службовы час.

***

У Міністэрстве юстыцыі рэспублікі пад нумарам 398 зарэгістравана новая грамадская арганізацыя — «Беларускі рэспубліканскі фонд падтрымкі дэмакратычных рэформ». Мэта яго — паслядоўнае ўсталяванне і развіццё дэмакратычных рэформ у Рэспубліцы Беларусь у галінах мясцовага самакіравання, эканомікі, навукі, культуры, экалогіі, прапаганда ідэй дэмакратыі і павагі да правоў чалавека.

***

Пасольствы Японіі адкрыюцца хутка ў чатырох рэспубліках былога СССР — у Беларусі, Казахстане, Узбекістане і на Украіне. Рашэнне аб гэтым прынята міністэрствам замежных спраў краіны, паведамляе газета «Іаміўры».

***

200 назіральнікаў з 13 міжнародных арганізацый розных краін будуць прысутнічаць на парламенцкіх выбарах у Грузіі 11 кастрычніка. Знаходжанне назіральнікаў будзе фінансавацца самімі арганізацыямі.

***

Штурмам узяты будынак самарскай абласной адміністрацыі. Зараз там гаспадарыць уладальнікі мэтавых чэкаў на легкавыя аўтамабілі, якія прыехалі з Поўначы і Далёкага Усходу. Усе яны прыехалі ў Самару па тэлеграмах з аўтамагазінаў, што запрашалі атрымаць аўтамабілі, аплачаныя яшчэ ў мінулым годзе. У магазінах машын не аказалася. Па словах адной з удзельніц гэтай акцыі, «майстра цэха аб'яднання «Якутзолата» Таццяны Стораж: мы патрабуем толькі аддаць сумленна заробленае».

***

10 мільярдаў рублёў патрабуецца пры цяперашніх цэнах на аднаўленне храма Хрыста Выратавальніка ў Маскве. Толькі золата на купалы павінна пайсці як мінімум 420 кілаграмаў.

***

Вядомы акцёр Леў Дураў пачаў здымацца ў фільме Юрыя Кары «Майстар і Маргарыта». Ён будзе іграць ролю Левія Матвея і 17 верасня ад'язджае на два тыдні ў Ізраіль на натурныя здымкі.

УРАДЖАЙ-92

Яго вялікасць ураджай пустазвонства не прымае—

такі лейтматыў гутаркі карэспандэнта «Звязды» з намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання Аляксандрам СТАРАВОЙТАВЫМ.

— Вы толькі што вярнуліся з камандзіроўкі па Віцебшчыне. Што «чуваць» на палях? Які настрой у людзей?

— Наша выязная брыгада пабывала ў Пастаўскім, Талачынскім, Глыбоцкім раёнах. Страшнае відовішча. Вельмі пацярпелі ад засухі ячмень, авёс, лён, пад страшэннай пагрозай другі ўкос траў, жывёлаводы вымушаны адкрываць траншэі з кармамі, якія назапашаны на стойлавы перыяд... Адно суцяшае: людзі ўпарта пераадольваюць цяжкасці, працуюць самаддана. Усе разумеюць: «летні дзень— год корміць. Бяда аб'ядноўвае, згуртоўвае.

— Ці задавальняюць вас тэмпы жніва?

— Безумоўна, хацелася б як мага хутчэй убраць вырашчаны ўраджай. Спадзяванні на пышны каравай былі неблагія. Калгасы і саўгасы адсеяліся ў аптымальныя тэрміны, расліны добра пайшлі ў рост. Яшчэ ў канцы мая мы ацэньвалі ўраджайнасць збожжавых у 29—31 цэнтнер з гектара. Падлікі паказалі: выйдзем на валавы збор зерня ў 8 мільёнаў тон. Але... Зноў усё пераблытала «нябесная канцылярыя». У чэрвені і за першую дэкаду ліпеня выпала ападкаў усяго 10—30 працэнтаў сярэдняй нормы. Працяглая засуха павярнулася вялікім недаборам ураджаю. Паводле прагнозаў спецыялістаў, валавы збор збожжа складзе каля 6 мільёнаў тон супраць 7 — у мінулым годзе.

Тэмпы жніва могуць і павінны быць шпарчэйшымі — сухое надвор'е дазваляе. У цэлым па рэспубліцы збожжавыя скошаны амаль на 80 працэнтах плошчаў. У гаспадарках Брэсцкай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей жніво блізіцца да завяршэння. Найбольш паспяхова ідуць справы ў Лунінецкім, Столінскім, Карэліцкім, Брэсцкім, Жабінкаўскім, Калінкавіцкім, Мазырскім, Гомельскім, Слонімскім, Нясвіжскім і іншых раёнах. Радуе, што і збожжавых тут намалочваюць па 30—34 цэнтнеры з гектара. У аснове поспеху ляжыць добра арганізаваная праца ўсіх удзельнікаў жніва, высокапрадукцыйнае выкарыстанне ўборачнай тэхнікі, сушыльнай гаспадаркі. Дзённыя прыросты ўбраных плошчаў тут складаюць 7—8 і больш працэнтаў.

— А хто, як мы іншы раз пішам, пляцецца ў хвасце?

— Шмат каласавых стаіць яшчэ на корані ў гаспадарках Віцебскага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Аршанскага, Талачынскага, Шклоўскага, Мсціслаўскага, Круглянскага раёнаў. Вядома, ёсць тут і свае аб'ектыўныя прычыны адставання, не на ўсіх участках вільготнасць зерня дазваляе сёння весці ўборку прамым камбайнаваннем. Але хіба ў гэтых і некаторых іншых раёнах цяпер у поўнай меры выкарыстоўваюцца ўсе наяўныя магчымасці ўборкі? Вядома ж, не. Час прыспешвае. Страты ўраджаю непазбежныя.

Складанае становішча сёлета склалася з нарыхтоўкай піваварнага ячменю. Улічваючы гэта, урад рэспублікі дазволіў яго нарыхтоўку з наступнымі адхіленнямі ад дзеючага стандарту: буйнасць — не менш чым 30 працэнтаў, утрыманне дробнага зерня — не больш за 15 працэнтаў, утрыманне бялку — не больш як 14 працэнтаў. Нарыхтоўка такога ячменю вядзецца па цэнах са скідкай 10 працэнтаў.

— Першым укосам намячалася ўбраць 2.157 тысяч гектараў сеяных шматгадовых і натуральных траў, закласці 6.273 тысячы тон кармавых адзінак, па 14,4 цэнтнера ў разліку на ўмоўную галаву жывёлы...

— На вялікі жаль, і тут ёсць нямала хібаў рознага характару. Недабор кармоў з першага ўкосу склаў 196 тысяч тон кармавых адзінак. На другі паўнацэнны ўкос няма чаго разлічваць. Пад пагрозай аказаўся гадавы план назапашвання травяністых кармоў.

Нарыхтоўшчыкам фуражу трэба вырашыць найскладанейшую задачу: нарыхтаваць яшчэ 2.960 тысяч тон кармавых адзінак травяністых кармоў. Ці ёсць для гэтага магчымасці? Абстаноўка экстрэмальная. І ўсё-такі нявыкарыстаныя рэзервы ёсць. Неабходна якасна убраць усе травы на пойменных лугах. Яны займаюць 93 тысячы гектараў. Ні на хвіліну не варта забываць пра нарыхтоўку кармоў з нясельскагаспадарчых угоддзяў. Канешне, нялёгка ўзяць зялёную масу на балотах, лясных палянах, абочынах дарог і г. д. Але ж іншага выйсця няма.

— Шмат саломы ляжыць яшчэ на палетках...

— Праблем тут таксама нямала—дэфіцыт тэхнікі, якая занята на іншых работах, не хапае прэсаў для цюкавання і... шпагату. Ён вельмі дарагі, не кожная гаспадарка ў стане купіць патрэбную колькасць. І тым не менш неабходна знаходзіць магчымасць для паўсюднай уборкі саломы з палёў. Сёння, як ніколі раней, важна своечасова і без страт убраць салому і мякіну. Адзін з лепшых варыянтаў іх выкарыстання—назапашванне сіласу з дабаўленнем зялёнай масы. Прыгоднае для гэтай мэты і бацвінне караняплодаў. Гэта дазволіць хаця б у нейкай ступені кампенсаваць недабор кармоў першага ўкосу і наблізіць запасы да леташняга ўзроўню. Ніхто не павінен цешыць сябе ілюзіяй, што нехта выдзеліць кармы з дзяржаўных фондаў. Спадзявацца трэба толькі на ўласныя рэзервы і магчымасці.

— Мінаюць аптымальныя тэрміны сяўбы азімага рапсу...

— Сёлета пад рапс мяркуем адвесці 70 тысяч гектараў. Вытворчасць дэфіцытнага алею вымушае пайсці на расшырэнне пасяўных плошчаў. Па меры вызвалення палёў ад папярэднікаў трэба паўсюдна прыспешваць гэтую неадкладную работу. Больш чым на 1—1,5 тыдня раней пачатая ўборка збожжавых культур дае магчымасць лепш падрыхтаваць і заправіць глебу ўгнаеннямі, прыкметна павялічыць азімы палетак рэспублікі. Гэту магчымасць варта выкарыстаць спаўна.

— Аляксандр Міхайлавіч, некалькі слоў пра наш «другі хлеб».

— Бульбяныя плантацыі з улікам прысядзібных і дачных участкаў займаюць сёлета 600 тысяч гектараў. Віды на ўраджай сумныя. Ранняя бульба з тых плошчаў, якія ўжо выкапаны, дала ў сярэднім па 100 цэнтнераў клубняў з гектара. Не густа! Пад вялікім пытаннем ураджайнасць сярэдніх і позніх сартоў.

Гутарыў Алесь БЯРЖЫНСКІ.

ШКОЛА ГАСПАДАРАННЯ

У «запрэжцы»—вецер перамен

Дзіўная справа: вакол толькі і чуеш — рынак бярэ за горла, рынак душыць... А ў Буда-Кашалёўскім раённым вытворчым інжынерным аб'яднанні колькасць працуючых не скарацілася, як на большасці прадпрыемстваў, а ўзрасла ажно на 430 чалавек і зараз складае больш за 800. Можа, гэта якая камерцыйная фірма, малое або сумеснае прадпрыемства? Ды не, самая сапраўдная дзяржаўная арганізацыя, якую ўсюды паранейшаму называюць райаграпрамтэхнікай.

— Як калектыву ўдалося злавіць спадарожны вецер?—з такога пытання пачалася наша гутарка з тэхнічным дырэктарам аб'яднання А. Заранкіным.

Андрэй Мікалаевіч адказаў на пытанне пытаннем:

— А чаму вы думаеце, што вецер спадарожны? Ён аднолькавы для ўсіх. Толькі мы здолелі «запрэгчы» яго. Не ведаем, праўда, на які час. Бо ён вельмі каварны, і калі памылішся, прымаючы рашэнне, дык човен, у якім мы плывём, можа сесці на мель.

Такі паварот падзей (зусім магчымы) у райаграпрамтэхніцы прадбачылі яшчэ некалькі гадоў назад, калі стала ясна, што ў барацьбе «за месца пад сонцам» яна можа не вытрымаць канкурэнцыі.

Райаграпрамтэхніка займалася рамонтам трактароў, рухавікоў, вузлоў і агрэгатаў да іх, збожжаўборачных і кормаўборачных камбайнаў. У яе распараджэнні мелася 120 грузавых аўтамабіляў, станцыя тэхнічнага абслугоўвання энерганасычаных трактароў, перасовачная механізаваная калона, якая абслугоўвала жывёлагадоўчыя памяшканні, рамонтна-будаўнічы ўчастак. За год калектыў выконваў розных работ на суму 4,5 мільёна рублёў.

...І нечакана ў дзверы пастукаўся рынак. Магілёўскі матарамонтны завод павялічыў свае вытворчыя магутнасці, рамонт каробкі перадач трактароў узяў на сябе завод у Прыямным, што на Віцебшчыне. Такім чынам, аб'ём рамонту ў Буда-Кашалёве рэзка скараціўся. А тут яшчэ адзін сюрпрыз: у сувязі з павелічэннем цэн многія гаспадаркі раёна пачалі адмаўляцца ад паслуг рамонтнікаў.

Перад арганізацыяй у поўны рост паўстаў выбар: альбо пакласці зубы на паліцу, альбо шукаць новую справу.

Не будзем удавацца ва ўсе перыпетыі, зазначым наступнае: кіраўніку райаграпрамтэхнікі М. Зянкевічу (а зараз генеральнаму дырэктару аб'яднання) ўдалося «намацаць» сцяжынку ў тумане пераходу да рынку. У рэспубліцы існавала «невырашальная» праблема: востра не хапала коркаў для бутэлек пад шампанскае і віно, накрывак для слоікаў пад маянэз і гарчыцу, палімерных скрынак для бутэлек. Мінсельгасхарч рэспублікі меў фонды на сыравіну для гэтай прадукцыі, але ў яго адсутнічала база для яе выпуску. Кіраўнікі міністэрства далі Міхаілу Іосіфавічу зразумець, што калі яго арганізацыя возьмецца за гэту справу, то ёй самой давядзецца шукаць неабходную тэхніку, станкі, механізмы, перавучваць людзей.

Прамаруджанне, здаўна вядома, смерці падобнае. Таму ва ўсе канцы краіны (СССР тады быў яшчэ адзіным) паляцелі і паехалі ганцы райаграпрамтэхнікі, пачаліся перападрыхтоўка кадраў, рэканструкцыя вытворчасці, дзе выслабаняліся плошчы для замены адной тэхнікі на іншую.

На прадпрыемстве ўздыхнулі больш вольна, калі набылі тры тэрмапластаўтаматы, якія могуць перапрацаваць за год 4,5 тысячы тон сыравіны. Палімерныя гранулы тут атрымліваюць з Наваполацка і Казані; услед за прадукцыяй, пра якую мы ўпамянулі вышэй, пачалі асвойваць і выраб поліэтыленавай плёнкі.

— Сёлета, — гаворыць А. Заранкін, — мы мяркуем вырабіць тавараў на 250 мільёнаў рублёў. Асноўная прадукцыя, як бачыце, — вырабы з палімераў. Але ж мы вырабляем прадукцыю і з жалезабетону — блокі, панелі, агароджы.

Рынак ёсць рынак. У ім выжывае больш моцны і знаходлівы. Дык вось бачачы, што кліентура аб'яднання часта не можа разлічыцца з ім, тут своечасова паклапаціліся, каб прадпрыемства мела грошы. Менавіта для гэтага прапанавалі гандлю тавары народнага спажывання — тую ж самую плёнку, пашырылі вытворчасць новых відаў вырабаў. Якім чынам? Зароблены грошы пусцілі ў абарот, у мясцовай прамысловасці выкупілі цагельны завод, а ў гомельскага аб'яднання «Карал» — участак па вырабу свяцільнікаў і бра. З'явіліся новыя грошы — і іх у справу.

Што ні кажы, а людзі ў Буда-Кашалёве — з выдумкай. Вось вам яшчэ ідэя — у недалёкім будучым інжынернае аб'яднанне мае намер вырабляць... каўбасы.

Аказваецца, аб'яднанне выкупіла ў аднаго з калгасаў 1.200 гектараў ворнай зямлі і 700 галоў жывёлы, заплаціўшы за ўсё пяць мільёнаў рублёў. І вось зараз тут ствараецца вялікая збожжагаспадарка, майстэрня, будзе ўзведзены свінарнік. Адным словам, грошы робяць грошы...

Прызнаем: калектыў аб'яднання сапраўды «круціцца». Сфера яго дзейнасці цяпер — ад Сібіры да Заходняй Еўропы. Яго работнікі паспяхова выходзілі на сувязі з чэхамі і балгарамі, а зараз кантактуюць з немцамі і пракладваюць дарогу да італьянцаў. Хто там далей за гарызонтам?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Эканоміка не церпіць мітусні, але і прамаруджвання не даруе

Ад жорсткага і нават безапеляцыйнага «зняць з займаемай пасады» да лаяльнага «давайце ж будзем рэалістамі» — такі дыяпазон эмацыянальных ацэнак выклікала абмеркаванне першага пытання з парадку дня чарговага пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі, якое адбылося пад старшынствам Міхаіла Мясніковіча 11 жніўня.

Размова ішла аб адказнасці службовых асоб за нездавальняючае выкананне рабочага плана па рэалізацыі асноўных напрамкаў палітыкі ўрада па прадухіленню спаду вытворчасці і фарміраванню ўмоў выхаду з крызісу. Ёсць праграма, ёсць канкрэтны, распісаны па месяцах і з указаннем канкрэтных выканаўцаў план дзеянняў, і нават ёсць самі дзеянні, а выніку няма. У ліпені спад вытворчасці ў параўнанні з тым жа месяцам мінулага года склаў 22 працэнты. Да 48 працэнтаў наблізіўся дэфіцыт бюджэту.

Паводле ацэнак справаздачы, якую зрабіў першы намеснік старшыні Дзяржэканомплана рэспублікі Рыгор Вячорка, не выкананы 4 з 61 пункта плана, 8 — перанесены на больш позні тэрмін. Старшынствуючы, аднак, з такой статыстыкай не згадзіўся, назваў значна больш нерэалізаваных або не працуючых на мэту задач практычна з усіх раздзелаў дакумента. У маі, напрыклад, планавалася знайсці спосаб адрэгуляваць да парытэту цэны на прадукцыю АПК і прамысловую прадукцыю, што настаўляецца яму. Рэчаіснасць жа такая, што Мінфін, адзін з адказных за выкананне гэтага задання, і да гэтага часу штомесяц шукае сродкі на датацыі вёсцы. Няясная сітуацыя са стварэннем небюджэтных фондаў для фінансавання часткі рэспубліканскіх навуковых праграм, якая павінна была праясніцца ў чэрвені. Не адабраны з іх найбольш актуальных. Мы паранейшаму не гатовы да зусім рэальнага ўводу нацыянальнай валюты ў іншых рэспубліках, не распрацавалі сваю фінансавую стратэгію і тактыку на гэты выпадак. Запісалі ў план пункт аб стварэнні ўмоў для расшырэння экспартнай дзейнасці, а прыток валюты ў рэспубліку не расце, а зніжаецца.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Яшчэ раз пра пажары

ПА ТЭМПЕРАТУРНАМУ РЭЖЫМУ — ГЭТА НЕ САМАЕ ГАРАЧАЕ ЛЕТА,
лічыць начальнік сектара клімату Галоўгідрамета Галіна ВАЛАБУЕВА:

— Такое лета сустракаецца раз у дзесяць гадоў. Па колькасці ападкаў яно — адно з найбольш засушлівых. У Мінску, напрыклад, за два месяцы — чэрвень і ліпень — выпала толькі 56 міліметраў ападкаў. У той час як па сярэдніх шматгадовых нормах іх за гэты перыяд звычайна бывае 170 мм. Вельмі блізкім па ўмовах надвор'я для цэнтральных і ўсходніх раёнаў Беларусі быў 1959 год. Тэмпература паветра тады была яшчэ вышэйшая, а ападкаў выпала за два месяцы (чэрвень і ліпень) усяго 65 мм. Самы цёплы гэты двухмесячны перыяд быў для Мінска ў 1936 годзе, калі сярэдняя тэмпература ў ліпені склала 21,7 градуса цяпла. У самы гарачы дзень у той год тэмпература паветра ўдзень узнімалася да 35 градусаў. За стогадовы ж перыяд вышэй яна не ўзнімалася.

Сёлета мы ўспрымаем лета як вельмі гарачае таму, што няма ападкаў. Але за апошнія гады цяплейшым было лета ў 1972 і 1988 гадах. Толькі тады ападкі былі ў норме і нават вышэй за норму, асабліва на захадзе рэспублікі — у Мінску за два месяцы ў 1972 годзе выпала 248 мм ападкаў. Людзі ўспрымалі такое надвор'е нармальна. Лета ў тыя гады прайшло для нас незаўважна, хоць і было цяплей нават, чым зараз, і над Масквой тады гарэлі тарфянікі.

Зараз жа трэці ўжо месяц стаіць спякота. А 11 жніўня ў большасці месц рэспублікі была ракордная за апошнія сто гадоў тэмпература — 35—37 градусаў цяпла. Дажджы, вядома, вельмі патрэбныя. Можа, яны зменшаць колькасць лясных пажараў.

ГАРАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ЛЯСЫ,
гараць грошы, якія ідуць на іх тушэнне.
А вінаватыя ў гэтым, найперш, мы з вамі.

Пажары ў лясах, выкліканыя неахайна кінутай іскрай і падхопленыя перагрэтай на сонцы травой і расліннасцю, былі і ў іншыя гады. Сумная статыстыка іх сведчыць, што ў 1959 годзе ў нас згарэла 23.919 гектараў лясоў, у 1963-м — 11 тысяч, у красавіку 1984-га — 6.800 гектараў.

— Характэрная асаблівасць пажараў гэтага года,— зазна-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па знешніх эканамічных сувязях Уладзімір РАДКЕВІЧ.

Замежныя інвестары

імкнуцца прысутнічаць на нашым рынку, але яны пакуль не хочуць рызыкаваць вялікімі грашыма. Чаму?

— Беларусь не так даўно пачала выступаць у свеце ў ролі самастойнага эканамічнага суб'екта. Якія пазіцыі рэспублікі ў гэтай якасці на міжнароднай арэне?

— За вельмі кароткі тэрмін дасягнута нямала. Рэспубліка прынята ў члены Міжнароднага валютнага фонду і Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця, карыстаецца падтрымкай Сусветага банка. Наладжаны сувязі з Камісіяй ЕС. Дарэчы, нацыянальным каардынатарам рэспублікі па сувязях з КЕС прызначаны намеснік Старшыні Саўміна М. Дзямчук.

З удзелам замежных экспертаў распрацавана праграма тэхнічнай дапамогі ў развіцці эканомікі Беларусі. У прыватнасці, праграмай прадугледжаны праекты рэканструкцыі двух нафтаперапрацоўчых заводаў у Мазыры і Наваполацку, вызначаны прыярытэтныя напрамкі дапамогі ў канверсіі заводаў «абаронкі», мадэрнізацыі такіх важных гаспадарчых галін, як энергетыка і транспарт.

— Сёння наша рэспубліка, дарэчы, як і іншыя краіны СНД, мае вострую патрэбу ў інвестыцыях замежнага капіталу. Але ён пакуль не спяшаецца на працягі былога СССР па добра вядомых прычынах. Што зроблена і робіцца ў Беларусі, каб зацікавіць замежных інвестараў?

— Не сакрэт, што стварыць рыначную эканоміку адкрытага тыпу, да якой мы імкнёмся, без інтэграцыі ў сусветную эканоміку вельмі і вельмі складана. Без замежнай дапамогі, капіталаў тэрміны неабходных пераўтварэнняў будуць зацягвацца. Дапамога патрэбна перш за ўсё для набыцця перадавой тэхналогіі і вытворчасці прадукцыі на ўзроўні сусветных стандартаў. І тут мы дакладна ўяўляем, што ва ўмовах вострай канкурэнцыі на сусветным рынку інвестыцый прыцягнуць інвестараў у Беларусь могуць толькі надзейныя прававыя асновы інвестыцыйнай дзейнасці, прывабныя эканамічныя ўмовы і стабільны палітычны клімат.

У Беларусі сёння замежныя інвестары маюць права набываць ва ўласнасць зямельныя ўчасткі, арандаваць маёмасць, зямлю і іншыя прыродныя рэсурсы, а таксама ўдзельнічаць у прыватизацыі аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці.

Заўважу: ўклады замежных інвестараў могуць уносіцца ў замежнай валюце ці ў рублях, атрыманых як у выніку абмену валюты ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, так і ад гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі. Мінімальны ўклад замежнага інвестара ва ўстаўны фонд (устаўны капітал) вызначаны ў размеры 20.000 долараў ЗША. Замежная юрыдычная і фізічная асоба можа набываць права інвестара пры куплі акцый на суму не менш 20 працэнтаў устаўнога фонду прадпрыемства.

— А як наконт ільгот замежным інвестарам?

— Найбольш поўны комплекс ільгот атрымліваюць прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі, ва ўстаўным фондзе якіх доля замежнага інвестара складае больш за 30 працэнтаў і ўся яго выручка ўтвараецца за кошт рэалізацыі паслуг і прадукцыі ўласнай вытворчасці. Яны вызваляюцца ад аплаты падатку на прыбытак на працягу трох гадоў з моманту аб'яўлення імі прыбытку, уключаючы першы прыбытковы год. Калі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі вырабляе асабліва важную для рэспублікі прадукцыю, то Савет Міністраў можа зменшыць яшчэ на тэрмін да трох гадоў стаўкі падатку на прыбытак на 50 працэнтаў.

Замежныя інвестыцыі ў рэспубліцы не падлягаюць рэквізіцыі ці прымяненню мер, роўных ёй па выніках, за выключэннем стыхійных бедстваў, аварый, эпідэмій і іншых абставін, якія носяць надзвычайны характар.

— А калі нейкі мясцовы Савет усё ж пойдзе на экспрапрыяцыю? Што тады?

— У выпадку прыняцця органам дзяржаўнага кіравання ці мясцовым органам дзяржаўнай улады акта, які супярэчыць закону ці парушае правы інвестара, страты, нанесеныя ў выніку прыняцця гэтага акта, па рашэнню суда ў адпаведнасці з яго кампетэнцыяй, кампенсуюцца органам, які прыняў гэты незаконны акт. Сума кампенсацыі вызначаецца ў размеры фактычных страт і вяртаецца інвестару на працягу трох месяцаў у той валюце, у якой першапачаткова былі ўнесены інвестыцыі.

Замежным інвестарам гарантуецца бесперашкодны пераход за мяжу той сумы ў замежнай валюце, якую яны зарабілі.

— Апошнім часам шмат высокапастаўленых прадстаўнікоў Беларусі ваяжыруюць на чале розных дэлегацый па ўсёй планеце. Заключаюць нейкія пагадненні, аб нечым дамаўляюцца, падпісваюць нейкія кантракты. Ствараецца ўражанне кіпучай дзейнасці, але не выніку не бачныя на паліцах магазінаў. Адсюль вывад: незалежнасць рэспублікі дала магчымасць пэўнаму колу кіраўнікоў падарожнічаць за дзяржаўны кошт. Ці так гэта?

— Зусім не так. Рэспубліка Беларусь як незалежная дзяржава — новая з'ява ў сусветнай палітыцы, і нам зразумела тая насцярожанасць, з якой заходнія палітыкі і бізнесмены падыходзяць да супрацоўніцтва з намі. Да апошняга часу гандлёва-эканамічныя адносіны Беларусі з развітымі краінамі мелі эпізадычны, нерэгулярны характар. Замежныя бізнесмены ведалі і працавалі толькі з Саюзам ССР, а Масквой, а цяпер прыходзіцца ім з намі наводзіць масты. Ужо заключана больш за дзесятак міжурадавых эканамічных пагадненняў.

Так, візіт урадавай дэлегацыі на чале са Старшынёй Савета Міністраў В. Кебічам у Італію і перагаворы, праведзеныя з урадавымі, дзелавымі і фінансавымі коламі, паказалі сур'ёзныя намеры італьянцаў супрацоўнічаць у мадэрнізацыі і развіцці гаспадарчага комплексу нашай рэспублікі на аснове доўгатэрміновых ільготных крэдытаў. Іх гатовы прадаставіць урад Італіі і прыватныя банкі.

У прыватнасці, вырашана, што ўрадавы крэдыт будзе накіраваны на закупку тэхналогій і абсталявання па вытворчасці ўсіх відаў дзіцячага харчавання (з мяса, малака, агародніны, садавіны), а таксама на вытворчасць упакоўкі для прадуктаў харчавання.

— Зразумела, што эканамічны прарыў нельга здзейсніць без прыцягнення значных замежных крэдытаў. Нялёгка іх атрымаць, але яшчэ больш складана не праесці, не пусціць на латанне першачарговых бюджэтных дзірак, а з розумам выкарыстаць. Як тут ідуць справы?

— Сродкі будуць накіраваны ў першую чаргу на структурную рэформу асноўных сектараў эканомікі, каб актывізаваць вытворчасць прадпрыемстваў, павысіць іх экспартны патэнцыял. Гэта машынабудаванне, хімія, нафтахімія, лёгкая прамысловасць, канверсія абаронных заводаў. У сельскай гаспадарцы гэта ў асноўным перапрацоўчыя галіны. Важная акалічнасць: прадастаўленне крэдытаў будзе весціся на конкурснай аснове.

— Сумесныя прадпрыемствы сталі першай спробай укаранення замежнага капіталу ў нашу эканоміку, але надвор'я ў гэтай справе яны пакуль не зрабілі. Дарэчы, колькі іх зараз? Якія іх перспектывы? Ці стануць яны сур'ёзнай з'явай у эканоміцы?

— Спачатку лічбы. Калі на 1 верасня мінулага года было зарэгістравана тры тысячы ўдзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці, то сёння іх ужо шэсць тысяч. У канцы 1990 года ў рэспубліцы было ўсяго 54 СП, зараз каля 500. Яны створаны з фірмамі 33 краін. Росту колькасці СП спрыяў і пераход іх рэгістрацыі ў кампетэнцыю рэспублікі.

Дынаміка стварэння СП, на першы погляд, добрая. За 1991 год іх з'явілася у 3,6 раза больш, чым за ўвесь мінулы перыяд. Але калі возьмем сумарны аб'яўлены фонд, то рост СП ужо не здаецца нам вельмі значным — толькі ў 1,87 раза.

Прычына, на наш погляд, у нестабільнасці эканамічнай сітуацыі і цяжкасці прагназіравання рэформ. Замежныя інвестары хочуць прысутнічаць на нашым рынку, але не хочуць рызыкаваць вялікімі грашыма.

Назіраецца тэндэнцыя да змяншэння ўкладаў ва ўстаўныя фонды СП. Так, сярэдні аб'ём замежных інвестыцый зменшыўся за год больш чым на 28 працэнтаў. Адной з прычын з'яўляецца недастатковая гібкасць заканадаўства, якое рэгулюе знешнія эканамічныя сувязі. З яго выпала важнае звяно — вытворчая і навукова-тэхнічная кааперацыя. Намі прапанаваны праекты нарматыўных дакументаў, якія прадугледжваюць ліквідацыю гэтага недахопу. Напрыклад, спрошчаную ў адносінах да СП працэдуру ўстанаўлення супрацоўніцтва і некаторыя льготы. Мяркуецца ўстанавіць безліцэнзійны і бяспошлінны ўвоз вываз кааперыруемай прадукцыі, а таксама ўплату экспартна-імпартных падаткаў не з кожнай здзелкі, а перыядычна ці пасля заканчэння тэрміну дагавора аб кааперацыі. Прыняцце гэтых дакументаў дазволіць зменшыць колькасць дробных СП, якія ствараюцца толькі намінальна.

Відавочна імкненне некаторых гаспадарчых структур пазбегнуць падатку на прыбытак за кошт атрымання статуса СП. Аднак у перспектыве гэта праблема павінна знайсці сваё вырашэнне, таму што дзеючае падатковае заканадаўства не прадугледжвае для СП якіх-небудзь ільгот, калі яны займаюцца пасрэдніцкай дзейнасцю. А мінімальныя размеры ўстаўнога фонду не дазволяць многім СП развіваць вытворчасць у неабходных размерах, і яны спыняць сваё існаванне.

Геаграфія замежных інвестараў дастаткова шырокая. Лідэрам па стварэнню СП у Беларусі з'яўляецца Польшча (110), затым ідуць ФРГ (35) і ЗША (24).

— Адна з прычын слабага прытоку замежнага капіталу — дрэнная інфармаванасць бізнесменаў аб Беларусі ўвогуле і не эканамічным патэнцыяле ў прыватнасці. Якім чынам можна хутчэй пераадолець гэты бар'ер?

— Так, я з вамі згодны. Каб супрацоўніцтва з замежнымі фірмамі было плённым, нам неабходна выпрацаваць сістэму ўзаемнага інфармавання аб эканамічных магчымасцях і патрэбнасцях, патэнцыяльных партнёрах, заканадаўчых і іншых нарматыўных актах, якія рэгулююць знешнеэканамічную дзейнасць. У гэтым напрамку намі ўжо зроблены першы крок: Гандлёва-прамысловай палатай рэспублікі выдадзены на англійскай мове каталог прадпрыемстваў, зарэгістраваных у якасці ўдзельнікаў знешніх сувязей, і зборнік, які ўтрымлівае заканадаўчыя асновы знешнеэканамічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Камітэтам выдадзены даведнік «Беларусь, бізнес-гід».

З нашым удзелам арганізавана выданне газеты «Беларускі рынак», часопісаў «Дело (Восход—Запад)», «Свободная экономика».

Рэгулярна праводзяцца міжнародныя канферэнцыі. Напрыклад, нядаўна прайшла другая канферэнцыя «Бізнес-92», якая была прысвечана праблемам прамых замежных інвестыцый, абмену эканамічнай інфармацыяй. У час яе правядзення адбылося каля 160 перагавораў патэнцыяльных партнёраў. Пры камітэце створана камерцыйная інфармацыйна-маркетынгавая фірма «Інформа». Мы імкнёмся выкарыстоўваць кожную магчымасць, каб як мага больш бізнесменаў у свеце ведалі пра Беларусь, праявілі цікавасць да эканамічнага супрацоўніцтва з ёю.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ЗАЙГРАЙ, ЖАЛЕЕЧКА, ЗАЙГРАЙ!

Вялікая цікавасць людзей да музычнай і песеннай спадчыны нашага краю. Усё новыя і новыя фальклорныя калектывы вяртаюць нам забытыя мелодыі. Але для гэтага патрэбны і народныя музычныя інструменты. Вось тут без таленавітых рук майстроў проста не абысціся.

Адзін з іх — жыхар горада Бяроза Брэсцкай вобласці Якаў Іванавіч ШАУЧУК. І скрыпку можа наладзіць, і дудку, і жалейку, і іншыя музычныя інструменты.

Яўген КАЗЮЛЯ. (БЕЛІНФАРМ).

НАВІНЫ

Хто звольніў рабочых мясных аддзелаў?

Непатрэбнымі сталі ў многіх магазінах Беларусі схемы разбірання жывёлы, якія дзесяцігоддзямі «ўпрыгожвалі» інтэр'еры мясных аддзелаў. Ялавічыну цяпер тут не сякуць. Але гаспадыні засталіся ў выйгрышы: выбар значна расшырыўся. На мясакамбінаце, адкуль прадукцыя ў ахалоджаным выглядзе паступае ў магазіны, мяса дзеляць на 14 картоў. Прычым цана на яго вар'іруецца ад 16 да 93 рублёў за кілаграм.

— Тое, што мяса з розных частак тушы павінна каштаваць па-рознаму, мы і раней ведалі, — гаворыць намеснік начальніка ўпраўлення Мінсельгасхарча Беларусі Галіна Рухля. — Але існаваўшая ўраўнілаўка прымушала прадаваць 81 працэнт прадукцыі па адной стабільнай цане. Пры гэтым камусьці даставалася выразка, а камусьці — косці. Рынак, які паставіў перад намі праблему збыту, прымусіў укараніць больш лагічную і справядлівую схему. Для гэтага давялося скараціць рабочых мясных аддзелаў. Распрацавалі маршруты падвозу мяса. Не ўсе праблемы пакуль што вырашаны: для транспарціроўкі ахалоджанай прадукцыі не хапае машын з ізатэрмічнымі фургонамі, даволі-такі знасілася і халадзільнае абсталяванне ў магазінах. Але мы не маем намеру адступаць, а, наадварот, будзем рабіць асартымент больш разнастайным.

Па новай тэхналогіі, якая набліжаецца да еўрапейскіх стандартаў гандлю мясам, акрамя Мінска, пачалі працаваць у Віцебску, Гродна і Слуцку. Вопыт будзе пашыраны на ўсе буйныя гарады Беларусі.

Наталля НЕВІДОМАЯ, кар. БЕЛІНФАРМ.

ЯК СТАЦЬ БАГАТЫМ

Паводле даных сацыялагічнага апытання, больш за 40 працэнтаў насельніцтва Беларусі плануюць паправіць сваё матэрыяльнае становішча, якое апошнім часам значна пагоршылася, шляхам пошуку дадатковага заробку. Але шмат хто з гэтых людзей яшчэ не вырашыў, да чаго прыкласці свае сілы. Менавіта ім мы і прапануем сёння гэты матэрыял. Спадзяёмся, што гэтыя парады дадуць магчымасць усім жадаючым пазбегнуць галечы і жабрацтва, прывядуць да заможнасці і дастатку.

СПОСАБ ПЕРШЫ
Як зарабіць з дапамогай тэлефона

Любая камерцыйная дзейнасць не будзе мець і паловы поспеху, калі няма тэлефона і інфармацыя не будзе імгненна прадастаўляцца заказчыку. Але шмат прыватных фірм, якія зараз ствараюцца, не маюць тэлефоннай сувязі, альбо іх уласнік частку дня знаходзіцца на сваёй асноўнай рабоце і не можа аператыўна звязвацца з кліентамі. У гэтым і заключаецца магчымасць вашага заробку.

Гэта справа больш за ўсіх падыдзе хатнім гаспадыням, пенсіянерам, жанчынам у дэкрэтным адпачынку. Магчымасць заробку заснавана на выкарыстанні вашага хатняга тэлефона. Адзіным патрабаваннем з'яўляецца тое, што вы павінны ўвесь рабочы дзень знаходзіцца дома.

Расклад дзеянняў прыкладна такі:

1. Вы павінны дакладна прадумаць, як падзяліць свой час, каб з 10 да 17 гадзін (з перапынкам) вас нішто не турбавала.

2. Неабходна даць аб'яву ў газету аб тым, што вы прапануеце свае паслугі ў якасці тэлефоннага дыспетчара.

3. Калі ў вас ёсць пішучая машынка і вы валодаеце машынапісам, то можаце прапанаваць дадатковыя паслугі па перадруку невялікіх работ. Такім чынам, гэты занятак становіцца падобным на працу сакратара, толькі дома.

4. Вызначце ўмовы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з заказчыкам, г. зн. кола пытанняў, па якіх вы будзеце прадстаўляць фірму; памер вашага заробку (у залежнасці ад колькасці тэлефонных званкоў альбо цвёрдая стаўка).

Вы павінны азнаёміцца з дзейнасцю той фірмы, якую будзеце прадстаўляць. Раім вам абслугоўваць некалькі (5—10, не больш) фірм адначасова. Прапануем вам таксама прыкладны разлік вашага заробку. Вы можаце дамовіцца аб цвёрдай стаўцы 250—300 руб. у месяц плюс дадатковая аплата за кожны тэлефонны званок увечары ці ноччу. Асобна трэба дамовіцца аб магчымасці міжгародніх званкоў з аплатай па квітанцыі.

Падлічыце магчымы заробак і пачынайце.

СПОСАБ ДРУГІ
Хатняя гасцініца ля дарогі

Як відаць з самой назвы, вы павінны жыць ля ажыўленай аўтастрады альбо побач з ёю і мець уласны дом. Гэты спосаб найперш падыходзіць жыхарам вёсак, раённых цэнтраў і ускраін вялікіх гарадоў. Усім добра вядома, што вадзіцелям і людзям, якія падарожнічаюць на машынах, практычна немагчыма знайсці месца для начлегу. Менавіта на гэтым і заснаваны гэты спосаб заробку.

Спачатку неабходна знайсці памяшканне для начлегу, прадумаць, колькі чалавек яно можа ўмясціць, колькі патрэбна бялізны, як зрабіць спальныя месцы, калі не хапае ложкаў. Раім абмежавацца 5 месцамі (з разліку на пасажыраў легкавой машыны). Можна прапаноўваць за дадатковую аплату лёгкае сняданне альбо вячэру, а таксама садавіну, гародніну і інш. тавары мясцовай вытворчасці.

У гэтым выпадку патрэбны і асобы падыход да рэкламы. Аб'ява ў газеце зусім не прыдатная. Неабходна на трасе ўстанавіць дзве рэкламныя шыльдачкі (так робіцца ва ўсім свеце) у двух накірунках руху за 100—500 м да гасцініцы, на якіх трэба напісаць, напрыклад, так:

«Хатняя гасцініца на 5 чалавек».

Трэба ўстанавіць такую ж шыльду на сваіх варотах, якія выходзяць на дарогу.

Плату за адну ноч вы можаце ўстанаўліваць да 100 руб. за чалавека. Гэта павінна залежаць ад якасці вашых паслуг.

Прыбытак будзе стабільным, калі вы будзеце прытрымлівацца наступных правілаў:

1. Заўсёды быць ветлівым у адносінах да кліентаў.

2. Падтрымліваць ідэальную чысціню і парадак.

3. Кожнаму кліенту пакідайце свае візіткі.

СПОСАБ ТРЭЦІ
Хатняе кафэ ля дарогі

Паесці ў дарозе — вельмі вялікая праблема для вадзіцеляў і пасажыраў. Калі ваш дом знаходзіцца каля дарогі з інтэнсіўным рухам: у вёсцы, райцэнтры альбо на ўскрайку горада, у вас ёсць выдатная магчымасць стварыць сваё прыватнае кафэ, якое будзе прыносіць вам значны прыбытак.

Прадумайце ўсе ўмовы, якія неабходны для існавання кафэ:

1. Вы альбо нехта з членаў вашай сям'і павінен добра гатаваць ежу.

2. У вас не павінна быць недахвату неабходных прадуктаў.

3. Да вашага дома павінен быць добры пад'езд і месца для кароткачасовай стаянкі.

Лепш за ўсё разабраць частку плота і абсталяваць прылавак з навесам, але так, каб яго можна было зачыняць нанач. Каля прылаўка могуць знаходзіцца лаўкі і столікі.

4. Вы павінны прадумаць сваё меню. Гэта могуць быць разнастайныя бутэрброды, сасіскі, каўбасы, сокі і кампоты. Але вы можаце прапанаваць і сапраўдны абед.

І ўвогуле, чым вышэйшай будзе якасць сервісу, тым большымі могуць быць цэны. Раім вам устанавіць наступныя расцэнкі: вышэй за дзяржаўныя, але ніжэй, чым кааператыўныя. Людзям будзе падабацца менавіта тое, што ежа — хатняя, і па боскіх цэнах. Для таго, каб падлічыць свае расцэнкі, вы павінны пачаць з падліку затрат на прыгатаванне ежы і ўтрыманне кафэ: цэны павінны быць на 30—50 працэнтаў вышэй затрат.

Пачынаючы гэтую справу, устанавіце рэкламныя шыльды, якія будуць добра бачны з дарогі.

СПОСАБ ЧАЦВЁРТЫ
Прыватны склад

Шмат кааператываў, малых прадпрыемстваў існуюць у маленькіх, непрыстасаваных памяшканнях альбо ўвогуле не маюць нават гэтага. Знайсці і ўзяць памяшканне ў арэнду — вялікая праблема. Тым больш вельмі цяжка знайсці памяшканне пад склад, на непрацяглы час. На гэтым і заснаваны прапануемы варыянт заробку. Яго выкананне магчыма толькі пры наступных умовах:

1. Вы можаце выдзеліць пад міні-склад вялікую кладоўку, частку пакоя альбо яшчэ нейкае памяшканне ў кватэры ці ў доме (падвал, гарышча, гараж і г. д.).

2. Гэтае памяшканне павінна быць абсталявана сігналізацыяй, а таксама іншымі сродкамі аховы ад злачынцаў (сабака, надзейныя запоры, дзверы, замкі, краты на вокнах і г. д.). Вы павінны гарантаваць захаванне маёмасці, у чым кліент павінен пераканацца сам. Прымаць на захаванне можна самую розную маёмасць: партыі тавараў, камп'ютэр, рэчы ў чамаданах, на ўчастку — аўтамабіль пад час адпачынку, цэглу і г. д.

Памятайце: залог вашага поспеху — ветлівасць, сумленнасць і гарантыя бяспекі для кліентаў і іх рэчаў.

СПОСАБ ПЯТЫ
Служба забеспячэння «Вёска — горад»

Людзі, добра знаёмыя з жыццём вёскі, ведаюць, што адна з вялікіх праблем — здаць вырашчаную сельскагаспадарчую прадукцыю. Калі вёска далёка ад горада і ехаць на базар цяжка, то застаецца толькі спадзявацца на прыёмшчыка з нарыхтоўчай канторы: прыме — не прыме? Альбо на выпадак, калі хтосьці пад'едзе на машыне і набудзе 2—3 мяхі бульбы.

Калісьці сяляне аб'ядноўваліся ў кааператывы, якія збывалі прадукцыю па выгадных цэнах. Сёння можна арганізаваць такога роду сервіс у рамках індывідуальнай працоўнай дзейнасці.

Чалавек, які хоча заняцца гэтай дзейнасцю, павінен добра ведаць магчымасці кожнай сям'і ў вёсцы і, самае галоўнае, колькі прадукцыі яны змогуць вырасціць і захаваць да вясны. Добра ўсё прадумаўшы і дамовіўшыся з людзьмі, неабходна прыступаць да наступнага этапу: знайсці ў горадзе спажыўцоў. Гэта могуць быць гандлёва-закупачныя кааператывы, рэстараны, кафэ, любыя прадпрыемствы, якія хочуць набываць прадукты для сваіх рабочых. Вы можаце прапанаваць два варыянты: вываз транспартам пакупніка сельгаспрадуктаў у вялікай колькасці восенню або пастаўкі раз ў 1—2 тыдні зімой. Апошняе больш выгадна, бо цэны зімой значна вышэйшыя. Старайцеся, каб адной з галоўных умоў, прад'яўленых да заказчыка, было забеспячэнне транспартам. Але можаце ўзяць гэтае пытанне і на сябе, хаця гэта і вялікі клопат.

Для яснасці прывядзём прыклад: раз на тыдзень у вёску прыязджае грузавік ад арганізацыі і забірае пэўную колькасць прадуктаў. Цэны і колькасць агавораны раней, якасць гарантавана. У вёсцы вы дапамагаеце ўзважваць і ўлічваць прадукцыю. З пастаянным партнёрам можна наладзіць круглагадовыя пастаўкі, а таксама прапаноўваць кансерваваныя і салёныя прадукты (агуркі, памідоры, капусту).

Але не трэба засяроджвацца толькі на гэтым. Прапануем вам прадумаць, як арганізаваць забеспячэнне вёскі прамысловымі таварамі ў якасці аплаты за сельгаспрадукцыю.

Ваш заробак як арганізатара будзе складаць каля 3—10 працэнтаў ад агульнай сумы, якую вы будзеце атрымліваць ад пакупніка прадукцыі. Велічыня працэнтаў залежыць ад колькасці і якасці прадуктаў. Астатнюю суму, згодна з уліковымі запісамі, вы заплаціце вяскоўцам.

Яшчэ раз прадумайце ўвесь «ланцужок» паміж вёскай і горадам. Толькі пасля гэтага пачынайце дзейнічаць, і пачынайце з аб'явы ў гарадской газеце:

«Штотыднёвыя пастаўкі высакякаснай сельгаспрадукцыі любымі партыямі самавывазам. Цэны ніжэй за рынкавыя. Разглядаюцца сустрэчныя прапановы тавараў. Звяртайцеся—тэл./адрас».

Калі вы сапраўды будзеце прапаноўваць тавар па якасці не горшы, чым на базары, але па ніжэйшых цэнах, то вы атрымаеце добры прыбытак і сапраўдную асалоду ад сваёй працы.

І ў заключэнне яшчэ некалькі парад. Перш за ўсё, калі вы вырашылі заняцца бізнесам, трэба параіцца з кваліфікаваным юрыстам, каб пазбегнуць непрыемнасцей пад час працы. Абавязкова трэба зарэгістравацца ў мясцовых органах улады, а потым ужо прымацца за справу. І калі ў вас хопіць настойлівасці і жадання працаваць, то заможнасць хутка прыйдзе ў ваш дом. Прыведзеныя спосабы могуць выклікаць у кагосьці ўсмешку, але трэба памятаць, што такія гіганты, як «Таёта», «Соні», «Макдональдс», пачыналіся менавіта з такіх дробных прадпрыемстваў і кафэ. Хацелася б, каб і ўсе тыя, хто прачытаў гэтыя парады і вырашыў сур'ёзна заняцца бізнесам, зрабілі б такую ж кар'еру.

Поспехаў вам!

Юрась ДРАЗДОЎ.

ГОРАД І ЧАЛАВЕК

Эпоха неасферы:

У Маскве створана Міжнародная акадэмія гуманітарнай урбаністыкі, у ліку заснавальнікаў якой—беларускія вучоныя. Агляднік «Звязды» сустрэўся з яе прэзідэнтам, доктарам філасофскіх навук В. ПІВАВАРАВЫМ.

мы яе творцы ці бязвольныя сузіральнікі?

— Віктар Рыгоравіч, якая «звышзадача» новай акадэміі?

— Павышэнне якасці жыцця. Чалавецтва ўсё больш канцэнтруецца ў гарадах, не вельмі клапоцячыся пра камфортнасць. Каб найлепшым чынам увасобіць ідэю «Горад для чалавека, а не чалавек для горада», мы выкарыстоўваем фундаментальную навуку. Патрэбна ў корані змяніць адносіны да «гома сапіенс» у гарадскім асяроддзі, забяспечыць яго сацыяльную і экалагічную абароненасць, паклапаціцца аб трансляцыі культуры з пакалення ў пакаленне. З гэтай мэтай аб'ядналі намаганні ВНУ, навукова-даследчых інстытутаў, вядомых вучоных, дзеячаў культуры, архітэктараў. А яшчэ — рэлігійных арганізацый і нават прадпрымальнікаў.

— Я так зразумеў, што Міжнародная акадэмія створана на базе маскоўскага творчавытворчага прадпрыемства «ГІУС» — гуманітарных ідэй урбанізацыі і самакіравання горада, якое вы таксама ўзначальваеце?

— Правільней будзе сказаць, што «ГІУС» стаў адным з ініцыятараў стварэння вышэйшай навукова-вучэбнай установы. І пакуль што яе асноўнай вытворчай базай. Прадпрыемства мае вопыт вывучэння гарадскога асяроддзя, экспертызы праектаў будаўніцтва, удзелу ў стварэнні інстытутаў самакіравання, мадэліравання сацыяльных працэсаў. Нас актыўна падтрымалі ў краінах СНД, а таксама ў Японіі, Швецыі, Індыі. Вельмі важна, што ў Японіі, якая даўно імкнецца зрабіць прарыў у гэтым напрамку і ўжо сёння мае што паказаць. У Беларусі вялікую цікавасць выказаў дырэктар інстытута сацыялогіі член-карэспандэнт АН Я. Бабосаў. Многія распрацоўкі мінчан прысвечаны чалавеку, і вопыт інстытута будзе карысным у міжнародным маштабе. Ідэя гуманізацыі горадабудавання, якую мы прапаведуем, павінна абапірацца на комплексныя даследаванні, што забяспечыць навуковае абгрунтаванне прымаемых рашэнняў.

— Калі ласка, крыху больш падрабязна пра саму ідэю гуманізацыі горадабудавання.

— Пачнём з адваротнага. Ва ўсіх на памяці «хрушчобы», якія, канешне, у свой час дапамаглі зняць вастрыню жыллёвай праблемы, але ператварылі гарады ў пчаліныя соты. Сёння ў абліччы нашых мегаполісаў таксама шмат ад тых «сотаў»: перазаселенасць, цесната вуліц, «душыць» транспарт, складана знайсці месца для простых чалавечых кантактаў. Адным словам, гарады для камфортнага жыцця прыстасаваны мала. Усё неяк рабілася спешна, на хапок. І калі не спыніцца, не змяніць горадабудаўнічую палітыку, мы так і застанёмся заложнікамі асфальтавага катка. Дайшло да таго, што людзі ўжо самі, шукаючы нейкага паратунку, спрабуюць стварыць хоць бы маленькі аазіс сярод гарадской пустыні на даху шматпавярховага дома — носяць у мяшках зямлю, садзяць дрэўцы... Памятаеце нядаўнюю публікацыю ў «Комсомольской правде» з Ерэвана? У Мінску таксама калісьці разводзілі сады на дахах высотных прыгажунёў-дамоў на праспекце Скарыны, але па задуме архітэктараў, і там не было стыхійнасці. Гэта значыць, усё было пралічана і прыгожа. Шкада толькі, што дазволілі тыя сады зруйнаваць.

Карацей, пытанне стаіць не проста аб граматнай забудове, а аб усебаковым развіцці тэрыторый. (Раней мы гаварылі аб усебаковым развіцці асобы, зараз — тэрыторый. Першае немагчыма без другога.) Патрэбны новыя, больш камфортныя серыі дамоў, у тым ліку малапавярховых і катэджнага тыпу. Арганізацыя гарадской прасторы павінна весціся з улікам дасягненняў архітэктурнай і навуковай думкі, а таксама прапаноў саміх жыхароў. Аб'ектаў сацкультбыту ў кожным мікраёне патрэбна столькі, колькі патрэбна, — не больш і не менш. Каб людзі не тоўпіліся ў чэргах у магазін, майстэрню, кінатэатр, паліклініку.

— Прабачце, Віктар Рыгоравіч, але ўсё гэта ўжо абвяшчалася...

— Вы хочаце запытаць, што ў нашай ідэі новага? Новага шмат. Напрыклад, зараз не на словах, а на справе ў грамадстве ажыццяўляецца свабода сумлення. Людзі не хаваюць сваёй веры ў Бога, ідуць да яго ў храм, і мы не маглі не ўлічыць гэтага. Культавая і некультавая дзейнасць рэлігійных арганізацый уключаецца ў агульную горадабудаўнічую канцэпцыю як яе паўнапраўны элемент. Для краін СНД яшчэ якая навіна. Мы лічым, што адраджэнне дзейнасці традыцыйных для таго ці іншага рэгіёна канфесій ужо ў бліжэйшай перспектыве павінна рабіцца ў асноўным за кошт рэабілітацыі існуючых культавых аб'ектаў. Тым больш, што зараз актыўна ідзе працэс іх вяртання вернікам.

— Сёння на прэс-канферэнцыі для журналістаў краін СНД, якую вы правялі, шмат пытанняў паступіла па парку чалавечых камунікацый. Што гэта?

— Ва ўсякім разе не проста парк культуры і адпачынку. Перш за ўсё гэта буйны інфармацыйны комплекс, які працуе з шырокім выкарыстаннем тэлевізійнай, кіна-і відэаапаратуры. Дадайце сюды цэнтры існуючых палітычных і іншых грамадскіх рухаў (тых жа «зялёных»), партый і арганізацый. Тут і бізнес-цэнтр, дакладней, месца для «клубных» зносін бізнесменаў, школы рамёстваў і г. д. Ідэю парку чалавечых камунікацый мы запазычылі — такія сістэмы ёсць у той жа Японіі, Англіі, некаторых іншых краінах. Цяпер дапрацоўваем яе ў прывязцы да нашых умоў (прыкладна аднолькавых у краінах СНД). Зараз выбіраем месца для рэалізацыі першага вопыту.

— Вы шчыра верыце, што такую махіну, як Масква ці нават Мінск, можна хутка «павярнуць тварам» да чалавека? Гуманізаваць гарадское асяроддзе за некалькі гадоў?

— Хутка ці не, але можна і патрэбна. Пры гэтым давайце не скідваць з рахунку тое, што ўжо сёння ёсць. Мы ж не будзем пачынаць на пустым месцы. Хаця, канешне, найбольшы і найхутчэйшы эфект можа даць сучасная, граматная забудова новых тэрыторый. Мы ўскладаем вялікія надзеі на асваенне прыгарадных зон вакол буйных прамысловых цэнтраў. Апытанні паказваюць, што многія гараджане хацелі б пераехаць у прыгарад, калі жыццё ў ім будзе наладжана цывілізавана. Мы абараняем ідэю кампактнага горада з нізкай шчыльнасцю насельніцтва і развітой інфраструктурай, экалагічна чыстага, камфортнага, у якім сфера працы сумешчана са сферай адпачынку. Гэты прынцып можа быць выкарыстаны і ў гарадскіх мікраёнах.

— Асноўны палігон для практычнай праверкі вашых напрацовак — Масква і блізкае Падмаскоўе?

— А яшчэ Ніжні Ноўгарад, Астрахань, Архангельск, Волагда. Будзем вельмі рады, калі нас падтрымаюць таксама беларускія калегі, і межы гэтага палігона пашырацца. Развіваючы фундаментальную навуку па ўсіх напрамках гуманізацыі горадабудаўніцтва, мы плануем выкарыстоўваць і беларускі вопыт. У свой час вашу сталіцу хвалілі за досыць прадуманае прамысловае будаўніцтва.

Акрамя таго, будзем займацца падрыхтоўкай кадраў спецыялістаў, фарміраваць навуковыя фонды і банкі даных горадабудаўнічай інфармацыі, і тут без цесных кантактаў з краінамі СНД, далёкага замежжа проста не абысціся. Таму акадэмія — міжнародная.

Акадэмія таксама гатова правесці экспертызу гуманітарных характарыстык аб'ектаў гарадскога асяроддзя, сацыялагічнае вывучэнне запытанняў суб'ектаў горадабудаўнічай палітыкі, дапамагчы вызначыць перспектыву. Так што звяртайцеся. Як я ўжо казаў, у Беларусі нашы інтарэсы прадстаўляе Яўген Міхайлавіч Бабосаў, дырэктар інстытута сацыялогіі. Яго тэлефон 39-48-65. У Маскву можна тэлефанаваць па нумары 209-66-64, а пісаць на адрас: 125047 Масква, 2-я Брэсцкая вуліца, дом 2/14, пакой 105.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

РОЗГАЛАС

ДЗЯДЫ НЕ ДАПУСЦЯЦЬ БЯДЫ

ЖЛОБІН. Ад іскры прайшоўшага поезда ўспыхнуў пажар на станцыі Мормаль Жлобінскага раёна. Схапілася полымем сухая трава, агонь пачаў падбірацца да дамоў вёскі з такой жа назвай. На бяду, моладзі ў вёсцы ў гэты час не было. Тады ўтаймоўваць стыхію ўзяліся дзяды-пенсіянеры, многія з якіх — ветэраны вайны. На дапамогу прыйшоў і старшыня сельсавета, цэнтрам якога з'яўляецца Мормаль.

Агульнымі намаганнямі полымя было затушана.

У СЛОНІМЕ КІДАЮЦЦА ГРАШЫМА. І НЕ МАЛЫМІ

СЛОНІМ. Здаецца, і невялікі горад Слонім, але багатых тут чамусьці вельмі многа. Яны налева і направа кідаюцца грашыма, а то могуць і наогул падараваць «іншамарку».

Менавіта такі падарунак дастаўся двум грамадзянам з сонечнага Азербайджана, якія прыехалі «падкормліваць» шашлыкамі турэцкую фірму «Энка». З дазволу гарвыканкома яны спраўна смажылі шашлыкі, у вольныя часіны займаліся махлярствам. За тры месяцы змаглі ўзяць у доўг каля ста тысяч рублёў, а напаследак «абулі» ваеннаслужачага, які аформіў гасцям сваю новую машыну «Аўдзі», што прыгнаў з Германіі і чакаў, пакуль азербайджанцы прывязуць грошы.

Але тыя, не маргнуўшы вокам, вырашылі, што ад такога куша адмаўляцца не варта, і, спусціўшы машыну з тармазоў, з ветрыкам і поўнымі кішэнямі грошай зніклі ў невядомым напрамку.

ДАЕШ БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ!

НАВАГРУДАК. (В. Пятровіч). Можа стацца, што ў хуткім часе ў сталічных ВНУ з'явіцца сур'ёзны канкурэнт у гэтым старажытным беларускім горадзе. Тут усур'ёз задумаліся над ідэяй, якую падаў прафесар многіх замежных акадэмій Барыс Кіт (у 30-х гадах ён з'яўляўся дырэктарам мясцовай беларускай гімназіі), аб адкрыцці ў Навагрудку Беларускага гуманітарнага ўніверсітэта. Гэтая навучальная ўстанова, на думку вучонага, павінна быць беларускай па форме і па духу. Сам Кіт абяцаў аказаць неабходную падтрымку — аж да прыцягнення замежных выкладчыцкіх кадраў.

Гарадскія ўлады падтрымалі гэтую прапанову і цяпер маюць намер звярнуцца да ўрада рэспублікі.

У КАГО «ВЯЛІКІЯ» ГРОШЫ?

Дзяржкамстат рэспублікі сведчыць: больш за ўсіх у нас атрымліваюць работнікі крэдытавання і сацыяльнага страхавання: у чэрвені сярэдняя зарплата ў іх склала 6.975 рублёў. Далей ідуць:

работнікі будаўніцтва — 5.612,
транспарту — 4.804,
апарату органаў дзяржаўнага кіравання — 4.717,
прамысловасці — 4.593,
сувязі — 4.155,
народнай адукацыі — 3.715,
культуры — 3.495,
устаноў аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння — 3.257.

Апошняе месца па даўняй звыклай традыцыі трывала займаюць сельскія працаўнікі — 2.939, якія, як вядома, надзелены ў нас «прыярытэтам», а ў чым ён выяўляецца ніхто з сялян так і не можа ўцяміць.

За паўгоддзе сярэднямесячная зарплата ў рэспубліцы ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічылася ў 7,4 раза, а грашовыя даходы ўсяго насельніцтва, г. зн. і тых, хто працуе, і хто не працуе, — у 5,3. У той жа час рознічныя цэны ў студзені—чэрвені на тавары і паслугі ўзраслі ў 7,9 раза. Хоць і нязначна, яны апярэджваюць рост заработнай платы. Непрыемна, але працуючым можна цярпець. І меркаваць, на каго гэты рост рознічных цэн кладзецца найбольшым цяжарам.

«Навошта нам тыя пяць Стоўбцаў?..»

Восенню мінулага года сем'і рабочых і будаўнікоў філіяла Мінскага маторнага завода самавольна засялілі дзевяціпавярховы жылы дом, які, між іншым, і прызначаны быў для рабочых і іх сем'яў.

Дом пабудаваны паўтара года назад. Справа была толькі ў тым, каб яго здаць. Але гарадскія ўлады забаранілі падключыць гэты, пакуль што адзіны ў райцэнтры, дзевяціпавярховы будынак да сваёй старой, сапсаванай каналізацыі, якая і без таго ўжо даўно не выконвае сваіх функцый і з года ў год забруджвае некалі паўнаводны і чысты Нёман.

Каб захаваць дом, у якім былі зроблены ўсе ўнутраныя работы, кіраўніцтва філіяла вымушана было абсталяваць у ім аўтаномную ацяпляльную сістэму. Пусты дом абаграваўся ўсю зіму.

Тыя, хто павінен быў атрымаць у ім кватэры, даўно ўжо па чарзе дзяжурылі ў пад'ездах, пільнавалі сантэхніку. Тое-сёе ўсё ж такі было вынесена навасельцамі з суседніх дамоў, унітазы падбіраліся пад колер пліткі і г. д. Але пры такім абароце спраў пачаўся зваротны працэс: напалоханыя суседзі па начах вярталі сваю здабычу на месца.

Цярпенне людзей скончылася: пад восень яны пачалі засяляцца самавольна, але згодна са спісамі гарсавета на атрыманне жылля. Засяляліся, нягледзячы на тое, што ў кватэрах не было, ды і ніхто не абяцаў, ні святла, ні вады, ні газу, ні цяпла. Самасельцы патрабавалі ад старшыні гарсавета В. Цвіркі выдаць ім ордэры на засяленне. Але старшыня не згаджаўся. Гораду патрэбна была каналізацыя.

Людзям, многія з якіх уладкоўваліся на працу менавіта дзеля кватэры, якая абяцалася ва ўсіх аб'явах, што запрашалі рабочых у філіял маторнага завода, наканавана было яшчэ восень, зіму, вясну (паводле самых аптымістычных падлікаў) правесці ў сваіх цесных кутках альбо ў піянерлагеры «Церамок». Але самым агідным было тое, што кватэра — вось яна. І ты ведаеш: яна — твая. Але жыць тут яшчэ не хутка будзеш. Бо горад чакае ад завода каналізацыі і таму не даваляе здаць дом. А завод не пабудаваў абяцаных ачышчальных прыстасаванняў, аднак жадае ўладкаваць кватэрнае пытанне сваіх працаўнікоў.

Мінулагоднюю сітуацыю ўдалося выправіць толькі дзякуючы адвечнай цярплівасці і даверлівасці нашых людзей. Самасельцы вярнуліся (хоць я і ўпэўнена, што хтосьці і зараз жыве ў сваёй кватэры «партызанам») у былыя куткі і «церамкі». І я не ўяўляю, колькі нерваў і перажыванняў каштавалі ім гэтыя перасяленні.

Лета зноў на зыходзе. Ачышчальныя прыстасаванні яшчэ не пабудаваны. А гэта значыць, што мінулагодняя сітуацыя можа паўтарыцца. Але галоўны дырэктар філіяла Мінскага маторнага завода В. Папко запэўнівае, што ачышчальныя будуць здадзены да пачатку восені і людзі змогуць атрымаць ордэры на засяленне. Справа нават не ў тым, што сістэма недабудаваная, а ў тым, што пабудаванае не вытрымлівае ніякіх праверак на якасць. Кажучы простай мовай — цячэ. Вышэй названы тэрмін здачы надзвычай неакрэслены. Але прыходзіцца спадзявацца. Бо да буйных заводскіх ачышчальных, са слоў дырэктара, можна падключыць пяць Стоўбцаў, не кажучы ўжо аб сумна знаёмым дзевяціпавярховіку і заводскіх інтэрнатах. Добра, калі б яны дапамаглі яшчэ не забруджваць не толькі навакольнае асяроддзе, але і наша штодзённае жыццё.

Вольга УЛЕВІЧ.

БЕЛАПАНАРАМА

* 10 ЖНІЎНЯ на пасяджэнні парламенцкай апазіцыі выказана занепакоенасць тым, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі яўна не спяшаецца склікаць чарговую сесію. У сувязі з гэтым разглядаецца магчымасць збору подпісаў народных дэпутатаў рэспублікі пад патрабаваннем склікаць сесію беларускага парламента прыкладна ў сярэдзіне верасня.

* **САВЕТ Свабоднага прафсаюза Беларусі даручыў яго старшыні Генадзю Быкаву і члену савета Паўлу Майсяевічу распрацаваць на працягу тыдня Палажэнне аб рэгістрацыі перыядычных арганізацый Свабоднага прафсаюза.**

* У РЭЧЫЦЫ па вуліцы Савецкай на месцы былога пасада вядуцца раскопкі. Занята на іх група археолагаў з Гомельскага абласнога археалагічнага цэнтра.

* **У ГРОДНА на рагу вуліц Горкага і Курчатава ўстаноўлены гранітны манумент у памяць аб загінуўшых на зямлі Афганістана.**

«ЛЮДЗІ ГІНУЦЬ ЗА МЕТАЛ...»

Начальнік паштовага вагона поезда Новасібірск — Калінінград К. адзейсніў, можна сказаць, подзвіг. У той час, калі тоны медзі, бронзы, цынку і г. д. вывозяцца з рэспублікі, ён, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча прывёз у Мінск з Ніжагародскай вобласці 1.100 кілаграмаў розных каляровых металаў. Адзінае, што засмучае у гэтай гісторыі: чыгуначнік вёз метал тайна, але зв узнагароджанне у 2.000 рублёў.

Супрацоўнікі кантрольна-прапускнога пункта на станцыі Сцяпянка затрымалі камерцыйнага дырэктара фірмы «Сана», які без ліцэнзіі хацеў вывезці ў Літву 36 тон 640 кілаграмаў медзі у злітках на суму 5 млн. 500 тысяч рублёў. Хто вінаваты, а хто не — вырашыць суд.

Некалькі дзён назад у Мінску з неахоўнага цэха ВА «Будмаш» быў здзейснены крадзеж трох тон бронзы на суму 150 тысяч рублёў.

(БелаПАН).

«ТЭТ-А-ТЭТ» З ЧАРАДЗЕЕМ

НАВАГРУДАК. Нядаўна ў пансіянаце «Свіцязь», што размясціўся каля возера з такой жа назвай, у адпачываючых з'явілася магчымасць не толькі прымаць сонечныя і гразевыя ванны, але і праходзіць курс лячэння ў экстрасенса. Індывідуальныя сеансы дае былы жыхар г. Баранавічы Валерый Сахно, які пражывае цяпер у Расіі.

На яго рахунку — перамогі на міжнародных конкурсах чараўдзеяў. Цікава, што «чараўнік» зусім не збіраўся займацца сваім рамяством у пансіянаце. Але пакуль засяляўся, анкетныя даныя сталі вядомы далёка за межамі месца яго адпачынку.

Цяпер ад жадаючых няма адбою — прыязджаюць цэлымі аўтобусамі: ці то так шмат хворых, ці людзям проста цікава ўсяго за 200 рублёў пабываць «пад чарамі» свайго земляка.



Узвядзенне буйнейшага ў Беларусі лёгкаатлетычнага манежа пачалося ў Брэсце. Яго арыгінальныя ажурныя канструкцыі ўстанаўліваюць мантажнікі трэста «Праммантаж», завершаць жа будаўніцтва падраздзяленні брэсцкага будтрэста № 8. У манежы можна будзе праводзіць буйныя спартыўныя спаборніцтвы, розныя мерапрыемствы, тысячы гараджан атрымаюць магчымасць прыходзіць сюды на заняткі фізкультурай і спортам.

НА ЗДЫМКУ: вырысоўваюцца контуры будучага збудавання.

Фота Эдуарда КАБЯКА. (БЕЛІНФАРМ).

МАТАРЫСТ-СТРАЛОК

Сярод белага дня пачаў страляніну рулявы-матарыст Віцебскага рачнога порта Х. Знаходзячыся на борце цеплахода ў нецвярозым стане, ён з незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы тройчы страляў па беразе Заходняй Дзвіны. П'яная забава абышлася дорага. Два васьмікласнікі віцебскай сярэдняй школы № 41 атрымалі раненні рук і ног.

Віктар ФЕДАРОВІЧ, (БелаПАН).

СТРЭЛЬБІШЧЫ. МІШЭНІ—УСЕ МЫ

За адзін толькі дзень колькасць лясных пажараў на тэрыторыі рэспублікі вырасла з 310 — 9 жніўня да 338—10-га. Як адзначыў адзін з кіруючых работнікаў Беларускага дзяржаўнага камітэта па экалогіі ў праграме НІКа, у большасці выпадкаў узнікнення ачагоў пажару вінаваты наведвальнікі лясоў. Але, як стала вядома нядаўна, не толькі яны. Полымем ахоплены 1000-гектарны лясны масіў у Крупскім раёне. Прычына ўзнікнення пажару—стрэльбішчы на танкавым палігоне. Паўстаюць два пытанні: няўжо нельга было перанесці стральбу на мішэнях на іншы час, хто будзе плаціць за нанесеныя рэспубліцы страты?

ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

ПІНСК. (С. Шапіра). Група навучэнцаў школы выяўленчага мастацтва вярнулася з аздараўленчай паездкі ў Нарвегію. Тры тыдні адпачынку праляцелі непрыкметна. Юныя пінчане не забыліся ў далёкай краіне і аб сваіх хворых равесніках. Яны павезлі з сабой выстаўку лепшых работ навучэнцаў школы і арганізавалі іх распродаж у горадзе Крысціянсандзе. На вырученыя грошы (звыш 1.000 нарвежскіх крон) былі закуплены 1.200 аднаразовых шпрыцаў, дзесяткі ўпаковак комплексных вітамінаў, якія спрыяюць вывядзенню з арганізма радыенуклідаў.

Яшчэ раз пра пажары

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

чыў намеснік начальніка ўпраўлення Мінлясгаса І. Мыслейка,— што ў дачыненні да тых месц, дзе яны прайшлі, нельга прымяніць тэрмін «згарэла». Бо асноўнае месца распаўсюджвання пажараў — забалочаныя ўчасткі ляснога фонду, якія падраздзяляюцца на пакрытыя лесам і непакрытыя. Большасць ахопленых пажарам участкаў — не пакрытыя лесам. Таму агонь праходзіць па моху, багуне, заходзіць у тарфянікі і там дыміць. А для лесу асаблівага ўрону няма. У Сяргеевіцкім лясніцтве Пухавіцкага раёна, на 11 жніўня пажарам ахоплена 300 гектараў. Сярод іх лесу толькі 70 гектараў. І то ён загінуў не ўвесь. Маладняк засохне, а старыя дрэвы, на якіх тоўстая кара, захаваюцца. Таму для нашых лясоў, ахопленых пажарамі, больш падыходзіць тэрмін «пройдзеныя агнём».

Ёсць і яшчэ адна прыкрая асаблівасць лясных пажараў гэтага года — у многіх выпадках надзвычайнае нахабства насельніцтва і абыякавасць да ліквідацыі пажараў. Нікога нельга сабраць. Раней разумелі ўсё і ішлі на дапамогу, а зараз — гары яно ўсё гарам. Псіхалагічна грамадства расстроена. І грашыма не прывабіш.

А лясы гараць. На раніцу 11 жніўня на тэрыторыі дзяржлесфонду было зафіксавана 5.160 пажараў. За гэты ж дзень 163 пажары ахапілі агнём 180 гектараў лясоў. На мінеральных глебах іх адразу лакалізавалі і патушылі. Цяжка справіцца з тымі пажарамі — а іх нямала, якія ўзнікаюць на паніжаных месцах, дзе тэхніку пусціць немагчыма — і вады няма, усё высахла. Рыдлёўкай тушыць пажар на тарфяніках тое самае, што дровы падкідваць у агонь. Не хапае і розных апырсквальнікаў. Таму фактычна гараць у гэтых пажарах мільёны грошай. 11 жніўня на тушэнні пажараў працавала 3.450 чалавек, у тым ліку 1.150 прыцягнутых. Затраты за дзень на тушэнне склалі 252 тысячы рублёў. Акрамя гэтага, было занята 377 трактараў, 12 экскаватараў, 160 пажарных машын, 96 ёмістасцей з трактарамі, 58 аўтамабіляў іншых марак. Гэта ўсё тэхніка прыцягнутая збоку. А было яшчэ задзейнічана і 240 пажарных машын. Тут трэба ўлічыць таксама: штодзённа працуе 18 патрульных самалётаў і верталётаў, на борце якіх знаходзяцца 60 дэсантнікаў-пажарных.

Як ні абсурдна, але лес, які прызначаны для людзей, ад іх жа і церпіць. І штрафамі абразуміць нікога нельга. А іх за парушэнне пажарнай бяспекі ў лясах ужо заплацілі 4.211 чалавек. Сума на 11 жніўня склала 54.712 рублёў. Але жадаючых пагрэцца ў спякоту ля вогнішча не змяншаецца. Толькі 11 ліпеня быў выяўлены 191 парушальнік. Між іншым, рашэннямі аблвыканкомаў забаронена наведванне лясоў у гэтыя летнія дні.

Каменціраваць нешта і тлумачыць тут няма патрэбы. Кожны павінен зрабіць адпаведныя вывады сам. Нельга забываць, што лясы ў многіх месцах вельмі блізка падступаюць да вёсак і асобных забудоў.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Адказны супрацоўнік навукова-даследчага інстытута, які займаецца праблемамі надзейнасці збудаванняў атамнай энергетыкі, заявіў што ахоўны саркафаг, зроблены на Чарнобыльскай АЭС, ненадзейны і можа пратрымацца каля пяці гадоў. Сценні саркафага пакрытыя трэшчынамі, фундамент — ненадзейны, а фільтры функцыянируюць не так, як трэба.**

* Парламент Таджыкістана адмяніў прыняты ў красавіку закон аб увядзенні прэзідэнцкай формы кіравання. Прэзідэнт Таджыкістана Набіеў пазбаўлены ўсіх дадатковых паўнамоцтваў, што былі прадстаўлены яму. Парламентарыі лічаць, што прэзідэнцкая форма кіравання малаэфектыўная і не правяла сябе ў неабходнай меры.

*** Паводле паведамленняў з Босніі і Герцагавіны, варажуючыя бакі не перашкаджаюць руху на тэрыторыі рэспублікі аўтакалон ААН з грузамі гуманітарнай дапамогі.**

* Прадстаўнік міністэрства замежных спраў Расіі Розанаў выказаў здзіўленне паведамленнямі ў некаторых заходніх сродках масавай інфармацыі адносна праекта рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН па Босніі і Герцагавіне. Гэта рэзалюцыя дапускае выкарыстанне сілы для забеспячэння бяспекі дастаўкі грузаў гуманітарнай дапамогі ў Боснію.

Вялікабрытанія, ЗША і Францыя падтрымалі гэту прапанову. Рэзалюцыю трэба было абмеркаваць яшчэ з прадстаўнікамі Расіі і Кітая, якія таксама з'яўляюцца членамі Савета Бяспекі ААН. Розанаў жа асудзіў сродкі масавай інфармацыі, якія прадставілі праект рэзалюцыі выключна як вынік дзейнасці Францыі, ЗША і Вялікабрытаніі. Паводле яго слоў, гэты дакумент з'яўляецца вынікам сумеснай дзейнасці ўсіх пастаянных членаў Савета Бяспекі.

*** Як заявіў прэзідэнт ЗША Буш, у ходзе ірэкных перамоў з прэм'ерам Ізраіля Равіным былі ўзгоднены асноўныя прынцыпы, на якіх Злучаныя Штаты гатовы прадставіць Ізраілю ўрадавы крэдыт на суму 10 мільярдаў долараў. Гэтыя грошы пойдуць на ўладкаванне ў Ізраілі кірэйскіх эмігрантаў з былога Савецкага Саюза. Гарантыі на крэдыт павінны быць зацверджаны палатай прадстаўнікоў і сенатам ЗША.**

* 16 чалавек загінулі пры аварыі верталёта непадалёку ад Вялікай Кітайскай сцяны прыкладна за 75 кіламетраў ад Пекіна. На борце верталёта знаходзіліся 18 японскіх турыстаў і 6 грамадзян Кітая.

«БІ-БІ-СІ»

*** Прэзідэнт ЗША Буш з узрушэннем адвяргае абвінавачанні адной з газет аб тым, што ён нібыта правёў ноч са сваёй памочніцай у адным са швейцарскіх аталяў у бытнасць віцэ-прэзідэнтам ЗША ў 1984 годзе. Паведамленне аб гэтым эпізодзе першапачаткова з'явілася ў адной з кніг, прысвечаных закуліснай палітычнай барацьбе ў Вашынгтоне, а днямі перадрукавала на першай паласе газета «Нью-Йорк пост». У адказ на пытанне журналіста Буш назваў гэта гнюснай хлуснёй.**

* Кабул зноў падвяргаецца ракетнаму абстрэлу. У горадзе ўзрываюцца сотні ракет і снарадаў. Абстрэл у панядзелак, як мяркуюць назіральнікі, быў самым магутным за 14 гадоў афганскага канфлікту.

*** Рашэннем міністэрства юстыцыі Расіі забаронена самая вядомая крайне правая партыя Расіі — ліберальна-дэмакратычная. Паводле паведамлення міністэрства дакументы аб рэгістрацыі яе ануляваны, пакольні ў іх утрымліваліся іржывыя даныя адносна колькасці членаў партыі. Партыя пазбаўлена права праводзіць сходы, вылучаць кандыдатаў на выбарах.**

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

*** Вучоныя з Расіі павінны атрымаць доступ да ўдзелу ў германа-японскай распрацоўцы касмічнай капсулы «Экспрэс». У ходзе работы над распрацоўкай будзе зроблена спроба вырашыць тэхнічныя праблемы пагружання капсулы ў калязямную атмасферу. Цяпер вывучаецца пытанне аб тым, якім чынам можна выкарыстаць для гэтага багаты вопыт расійскай касманаўтыкі.**

*** З сярэдзіны кастрычніка Японія ўпершыню атрымае магчымасць удзельнічаць у сусветнай місіі ААН. 600 салдат японскай арміі, паліцэйскіх і мекальні назіральнікаў будуць накіраваны ў Камбоджу, каб дапамагчы аднаўленню гэтай краіны, разбуранай грамадзянскай вайной.**

* Падае курс долара ў адносінах да курса маркі ФРГ. На франкфурцкай біржы за 1 долар даюць 1.46 маркі.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

АГОНЬ НЕ ВЫБІРАЕ

Чым далей працягваецца спёка, тым больш бяды яна прыносіць. Гараць лясы, тарфянікі, палі. А цяпер чарга дайшла і да населеных пунктаў. Гэтымі днямі пажар вынішчыў 12 дамоў у вёсцы Сяльцы і 34 хаты вёскі Калюга, што ў Глускім раёне Магілёўскай вобласці.

Наогул, пажар не выбірае. Пазаўчора згарэлі два дамы і чатыры гаспадарчыя прыбудовы ў вёсцы Бытча, што ў Барысаўскім раёне. Колькі ён яшчэ будзе знішчаць жывёл, людзей, лясоў, наўрад ці хто адкажа...

Старыя людзі кажуць, што гэта сама прырода помсціць чалавеку за тое, што ён нахабна залез у яе нетры. Магчыма. Але раніці яе, капалі, асушвалі адны, а бядуюць і адказваюць перад стыхіяй зусім іншыя людзі.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Злодзея знайшлі, украдзенае—шукаюць

У канцы ліпеня з цэха ВА «Граніт» у г. п. Мікашэвічы быў украдзены блок з радыеактыўным элементам цэзій — 137. Па падазрэнню ў здзяйсненні злачынства затрыманы жыхар Салігорска С. Блок жа пакуль што не знойдзены.

(БелаПАН).

«НЕ ХАЧУ Я БУЛКІ З МАКАМІ!»

ЖЛОБІН. Незвычайную аперацыю пад кодавай назвай «Мак» правяла нядаўна жлобінская міліцыя. Ахоўнікі правапарадку зрабілі вяаж па навакольных вёсках і па горадзе ў пошуках пасеваў канаплі і маку. Многіх гараджан і жыхароў раёна яны засталі з «таварам» на агародах. І ўсе пасевы пайшлі пад корань. Хоць шмат хто сядзіў «забароненыя» расліны для гаспадарчых патрэб.

«Нельга», — сказалі супрацоўнікі міліцыі. А найбольш дбайныя гаспадары, якія збіраліся спячы смачных булак і пасыпаць іх макам, атрымалі яшчэ і адміністрацыйныя штрафы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

КАЛІ ДА ІНШАГА ІДЗЕ НЯВЕСТА...

Вядомы тэнісіст Стэфан Эдберг нядаўна аддаў сваё першае месца ў міжнароднай класіфікацыі. Але затое перамог у іншым: ажаніўся з вядомай фотамадэллю 26-гадовай шведкай Анет Ольсен, якая раней лічылася нявестай саперніка Эдберга — тэнісіста Матса Віландэра. Цікава, што гэта не перашкодзіла Матсу прыняць запрашэнне на іх вяселле...

Яшчэ раз пацвердзілася ісціна: тэніс — гэта адна вялікая сям'я.

УСІХ ПУТАН — НА РАБОТУ

На поўдні Кітая нядаўна былі праведзены масавыя аблавы на прастытутак. Дзяўчаты лёгкіх паводзін былі знойдзены ў клубе былых кадравых работнікаў КПК (кітайскай партыі камуністаў), якія даўно ўжо на пенсіі, і адстаўных ваенных.

Цікава, што з путанамі ў Кітаі звычайна не цырымоняцца і не чытаюць ім лекцый пра нездаровы лад жыцця, а адразу адпраўляюць «выхоўвацца» на папраўчыя работы.

ПАСПАЛІ І ПАМЫЛІСЯ

Зусім не думалі прымаць уначы халодны душ пасажыры, якія знайшлі прытулак у зале чакання Екацерынбургскага вакзала, на лаўках, на падлозе, на падаконніках. Да адпраўлення паязду заставалася шмат часу. Нечакана ў зале з'явіўся мужчына ў фуражцы чыгуначніка і прапанаваў усяго за 50 рублёў начлег у камфартабельных вагонах-гасцініцах, якія зусім блізка ад вакзала.

Людзі кінуліся на начоўку, атрымаўшы квітанцыі аб аплаце, яны накрыліся коўдрамі і хутка заснулі.

Толькі спаць доўга не выпала. А трэцяй гадзіне ночы вагоны падчапіў цеплавоз і пацягнуў іх на мыйку.

Спалоханыя пасажыры бегалі па вагонах і крычалі, але іх ніхто не чуў.

І зноў— жыццё ў крэдыт?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

міку без адпаведнага пацвярджэння іх таварнай масай, выпушчанай прадукцыяй яшчэ нікому шчасця не прыносіла. Часовая палёгка. Гэта датычыць і нас. Між іншым, як можна было зразумець міністра, Герашчанка, падчас нядаўняй сустрэчы з ім, выказаў прэтэнзіі адносна крэдытнай эмісіі ў нас. Што ж, нікому не падабаецца, калі дзейнічаюць у абход яго.

Вядома, на прэс-канферэнцыі ішла размова аб заключаным з Расіяй міжбанкаўскім пагадненні. Яшчэ раз звярну ўвагу: пра гэта газета пісала ўжо. Варта толькі падкрэсліць: мы ўвозім з Расіі каля 70 працэнтаў усёй прадукцыі, яна — наш пераважны гандлёвы партнёр, і пастаноўка ўзаемаразлікаў з ёю на трывалую аснову — гэта, вядома ж, добра. Дрэнна тое, што ўжо цяпер, як сведчаць фінансісты, маем у гандлёвым абароце з Расіяй адмоўнае сальда, а становішча можа значна ўскладніцца пры пераходзе да ўзаемаразлікаў праз канверсаваную валюту — такая ж радасць маячыць вельмі блізка... Значыць, ужо цяпер трэба моцна думаць аб збалансаванасці паставак.

А яшчэ, як было паведамлена на прэс-канферэнцыі, Герашчанка гразіўся ў хуткім часе запрасіць на сустрэчу калег з рэспублік, каб усім разам дасягнуць дамоўленасці аб узаемазаліках. Прычым пад адмоўнае сальда ў абароце з Расіяй ён абяцае даваць крэдыт пад 80 працэнтаў. Жорстка. Разам з тым, пад падобныя працэнты банк Расіі дае крэдыты і сваім унутраным кліентам.

Увогуле, міністр фінансаў падкрэсліў: настае новы этап эканамічных узаемаадносін, і гэты этап будзе вельмі цяжкі.

Бясспрэчна. Мы, здаецца, ушчыльную падышлі да поўнай самастойнасці эканомікі, да магчымасці есці асобна, а ніяк нельга сказаць, каб наша сённяшняя эканоміка, менавіта сённяшняя — з усёй яе парадаксальнай структурай, гігантызмам і схільнасцямі да банкрутства, магла нам абяцаць лёгкае жыццё, магла добра нас накарміць. Але ж якой яна будзе заўтра — поўнасцю залежыць ад нас. Толькі б не хістацца, то да рынку, то ад рынку, як нярэдка робім цяпер, весці строга вытрыманую, мэтанакіраваную эканамічную палітыку.

Іван БАРАНОЎСКІ.

Эканоміка не церпіць мітусні, але і прамаруджвання не даруе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Планавалі ўдасканаліць з арыенцірам на сусветныя «стандарты» аплату працы і не ўдасканалілі. Пакідае жадаць лепшага механізм падтрымкі прадпрымальніцтва, развіццё рынку каштоўных папер і рынку наогул...

Прыкладаў, падобных на гэтыя, на пасяджэнні прагучала нямала. Былі спробы апраўдацца знешнімі прычынамі, якія ад рэспублікі не залежаць, унутранымі аб'ектыўнымі цяжкасцямі, адсутнасцю некаторых спецыялістаў. Усё гэта так. Але ёсць прычыны і суб'ектыўныя. Спачатку далёка не ўсе выканаўцы аднеслися да сваіх заданняў сур'ёзна і нефармальна. Здаралася, абыходзіліся адпіскамі ў адказ на патрабаванні прадставіць справаздачу або свае меркаванні і прапановы ў спецыяльна ўтворараную кантрольную камісію. Здаралася, са спазненнем аспрэчвалі мэтазгоднасць таго ці іншага рашэння, зацягвалі тэрміны. Гэты этап, адзначаны рознымі пакараннямі і нават двума звальненнямі работнікаў адміністрацыйнага апарату, ужо мінуў. Цяпер, хоць і з некаторым спазненнем, разлікі, ідэі і прапановы пачынаюць сцякацца ў Савет Міністраў. Праблем па-ранейшаму многа, выявіліся і рознагалоссі па некаторых прапануемых рэцэптах аздараўлення эканамічнай і сацыяльна-культурнай сфер. Таму ўдзельнікі гэтага пасяджэння прынялі рашэнне яшчэ раз вярнуцца да тэмы ў канцы жніўня, на пасяджэнні, так званага, «вялікага Саўміна».

Прэзідыум разгледзеў таксама пытанні аб праектах Крымінальнага і Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аб утварэнні пры Савеце Міністраў дэпартамента эканамічнага кантролю, які будзе сачыць за правільнасцю і паўнатой выканання ў рэспубліцы дзеючых законаў і пастаноў урада сацыяльна-эканамічнай арыентацыі. Абмеркаваны таксама паступіўшыя ў ходзе пасяджэння пытанні аб нездавальняючай рабоце па барацьбе з пажарамі і аб эканамічным становішчы на бягучы момант.

Ганна ГЛАДЫШАВА, (БЕЛІНФАРМ).

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту М. ГРУШЭЎСКАГА.

ЗАКАНЧВАЕМ КОНКУРСЫ

64—92—12
Вінтар Шульга
(г. Мінск)



Белыя: простыя a1, a3, c3, c5, e7, h4(6).
Чорныя: простыя a7, d8, e3, f6, g5, g7 (6).
Ход і выйгрыш белых (чатыры ачкі).

100—54—12
Пётр Шилудаў
(г. Наваполацк)

Белыя: простыя 15, 17, 21, 24, 25, 34, 36, 41, 43, 44, 48 (11).
Чорныя: простыя 4, 7, 8, 9, 16, 18, 23, 27, 32, 33, 37 (11).
Пачынаючы, белыя выйграюць (чатыры ачкі).

Шашкі+шахматы—3—12
Уладзімір Сапижынскі
(г. Рагачоў)



Белыя: ферзь d4, конь d5, слон e5, пешка c3, простыя a2, f2(6).
Чорныя: простыя a6, f6 (2).
Белыя пачынаюць і запіраюць дзве простыя чорныя (адно ачко).

ПРАВЕРЦЕ АУТАР

Для тых, хто не ўдзельнічаў у конкурсах, прапануем рашыць заканчэнне, якое прыслаў наш мінскі чытач Уладзімір **Юшчанка:**



Белыя: простыя c3, d2, f2, h4 (4).
Чорныя: простыя c5, e5, e7, f4 (4).
Ход белых. Яны адсталі ад чорных у развіцці трох шашак, але... выйграюць. Так сцвярджае аўтар. А як лічыце вы?

Прозвішчы чытачоў, якія прышлюць правільныя рашэнні, будуць апублікаваны.

РАДЫЁ

14 жніўня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 19.45, 23.00.

7.00—«Радыёфакт». 8.15 — «Вясковыя ростані». 9.15 — «Жыватворныя вытокі». 10.15 — для дзяцей. У. Ліпскі. «Кляксы-Вакса і Янка з Дзіўнагорска». 11.20 — «Саветы: улада і справы». 12.00 — «Апоўдні». 13.00—«У абедзенны перапынак». 14.00—новыя запісы музычнай радыёфанатэкі. 15.15 — музычная праграма, прысвечаная калектыву сумеснага беларуска-швейцарскага прадпрыемства «Белкампексім». 16.05—«Гульня без пройгрышу». Спартыўная праграма. 16.30 — «У свеце чароўных гукаў». 17.00—выступаюць салісты і Дзяржаўны канцертны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга. 18.00—перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — «Дзень нашага жыцця». 20.05 — вячэрняя казка. 20.25 — «Вяртанне да вытокаў». Музычная праграма. 20.40—«Мазурава, 21». Прафсаюзны вестнік. 21.00 — эстрадны канцэрт. 22.00—музычная праграма. 23.10 — лёгкая аркестравая музыка. 0.00—«Начны канал».

НА ДВОР'Е

13 жніўня

Сёння ўдзень па паўночнаму захаду рэспублікі чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ў Мінску і Віцебску — 22—24, Брэсце і Гродна — 23—25, Магілёве — 26—28, Гомелі — 27—29 градусаў цяпла. У наступныя двое сутак па паўночнаму захаду — кароткачасовыя дажджы, магчыма, з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы — 13—18, удзень — 22—27 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ПРАДАМ

Карбід кальцыю. Тэл. (812) 110-56-25 у горадзе Санкт-Пецярбургу.

ПОЛЯРОН

Прапануем прыбор для дыягностыкі хадавой часткі аўтамабіляў



Устройства лазернае камбінаванае УЛК-2, УЛК-3 — прызначана для выкарыстання ў тэхналагічных працэсах рэгуліроўкі параметраў хадавой часткі легкавых і грузавых аўтамабіляў на станцыях тэхнічнага абслугоўвання, у дыягнастычных цэнтрах, аўтатранспартных прадпрыемствах, у тэхналагічных працэсах зборкі на прадпрыемствах аўтамабілебудавання:

- вуглоў развалу і сыходжання колаў,
- падоўжнага і папярочнага вуглоў нахілу шкворняў,
- суадносін вуглоў павароту пярэдніх колаў.

Устройства складаецца з канструкцыйна закончаных і функцыянальна звязаных паміж сабой асноўных блокаў:

- блокаў кантролю левага і правага вуглоў,
- трымальнікаў люстэркаў,
- пераўтваральніка напружанняў,
- юсціровачных стоек.

Сілкаванне ўстройства ажыццяўляецца ад сеткі пераменнага току напружаннем 220 В і 12 В з частотой 50 Гц. Устройства пастаўляецца ў двух варыянтах:

- УЛК-2 — легкавы варыянт,
- УЛК-3 — грузавы варыянт.

СПЯШАЙЦЕСЯ НАБЫЦЬ УСТРОЙСТВЫ УЛК-2, УЛК-3 па адрасу: 290619, г. Львоў, вул. Угорская, 14. Тэл. 42-64-41, 42-60-29.

Мальва лясная

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: дзікая мальва, прасвірняк, калачыкі, скулачнік, сляза

На Беларусі расце паўсюдна як пустазелле ўздоўж дарог, каля жылля, па пустках, у агародах, на ўскрайку палёў.

Адна- ці двухгадовая, часам шматгадовая расліна вышынёй 30—120 см. Сцябло прамое, або ляжачае, або прыўзнятае, галіністае, густа пакрытае валаскамі. Корань стрыжневы, доўгі, разгалінаваны, мачкаваты, моцны.

Лісце доўгачаранковае, чарговае, круглява-сэрцападобнае, пільчатае па краях, густа пакрытае валаскамі. Верхняе і сярэдняе лісце 7-лопасцевае, самае верхняе — 5-лопасцевае.

Цвіце з чэрвеня па верасень. Кветкі ружаватыя, буйныя, 5—7 см у папярочніку, размяшчаюцца па 1—5 у пазухах лісця, на доўгіх валасістых кветаножках. У цэнтры пялёсткаў ёсць больш цёмныя пражылкі.

Плады сухія, распадаюцца пры паспяванні на некалькі плоскіх пупышкападобных сямянак. Паспяваюць у ліпені—кастрычніку.

Кветкі і лісце мальвы лясной утрымліваюць шмат лячэбнай слізі, вітаміну С (да 220мг%), ёсць карацін, цукар, фарбавальнае рэчыва, гліказід мальвін. У насенні знойдзены напаўвысыхаючы тлусты алей.

У ГАСПАДАРЦЫ

можна атрымаць з расліны ўстойлівыя фарбавальнікі шэрага, сіне-фіялетавага, чорнасіняга колеру для афарбоўкі шарсцяных тканін.

ПРЫ ХАРЧАВАННІ

выкарыстоўваюць маладое лісце і плады мальвы. З лісця можна гатаваць салаты, вінегрэты, гарніры, першыя і другія стравы. Непаспелыя плады ўжываюць пры прыгатаванні баршчоў, расольнікаў, салянак, начынак для піражкоў.

ЗАКУСКІ

САЛАТА З МАЛЬВЫ. Лісце прамыць разоў колькі халоднай вадой, бланшыраваць 3—5 хвілін, нарэзаць, дабавіць здробненую рэпчатую цыбулю, моркву, цёрты хрэн, пасаліць, заправіць маянэзам ці смятанай. Пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

150 г лісця мальвы, 50 г моркву, 25 г рэпчатай цыбулі, 20 г хрэну, 25 г смятаны (маянэзу), соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

САЛАТА З АГАРОДНІНЫ З МАЛЬВАЙ. Моркву, капусту нацерці на буйной тарцы, дабавіць зялёную цыбулю, зялёны кансерваваны гарошак, бланшыраваць здробненае лісце мальвы, пасаліць. Заправіць маянэзам ці смятанай. Пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

100 г мальвы, 50 г моркву, 75 г капусты, 50 г зялёнага гарошку, 25 г зялёнай цыбулі, 50 г маянэзу (смятаны), соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

САЛАТА РЫБНАЯ З МАЛЬВАЙ. Кавалачкі адвараной рыбы пасыпаць зялёнай цыбуляй, здробненай мальвай, пасаліць. Заправіць вострым соусам. Пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

200 г рыбы, 50 г мальвы, 25 г зялёнай цыбулі, 50 г соусу вострага, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

САЛАТА МЯСНАЯ З МАЛЬВАЙ. Кавалачкі адвараного ці смажанага мяса змяшаць з нарэзанай кубікамі адвараной бульбай, нацёртай на буйной тарцы сырой морквай, зялёным кансерваваным гарошкам, марынаванымі пладамі мальвы, здробненымі крута зварным яйкам, зялёнай цыбуляй, пасаліць. Заправіць маянэзам ці смятанай. Пасыпаць зяленівам пятрушкі і кропу.

150 г мяса, 50 г бульбы, 30 г моркву, 50 г зялёнага гарошку, 25 г зялёнай цыбулі, 100 г марынаваных пладоў мальвы, 1 яйка, 50 г маянэзу (смятаны), соль, зяленіва пятрушкі і кропу.

ІКРА З МАЛЬВЫ І ІНШЫХ ТРАЎ. Лісце мальвы, крапівы, шчаўя прамыць, бланшыраваць 1 хвіліну, прапусціць праз мясарубку, змяшаць з пасераванай цыбуляй, таматным соусам, молатым чорным перцам, часнаком, расцёртым з соллю, і тушыць на слабым агні 10—15 хвілін.

100 г лісця мальвы, 40 г крапівы, 30 г шчаўя, 25 г рэпчатай цыбулі, 1—2 зубкі часнаку, 15 г алею, 25 г таматнага соусу, перац, соль па смаку.

МАРЫНАВАНАЕ ЛІСЦЕ ЦІ ПЛАДЫ МАЛЬВЫ. Лісце ці плады мальвы прамыць халоднай вадой, укласці ў слоікі, заліць марынадам. Накрыць поліэтыленавымі накрыўкамі. Захоўваць у халодным месцы.

Для марынаду: 500 мл вады, 15 г цукру, 15 г солі, 20 мл сталовага 5-процэнтнага воцату, па 5 зярнятак духмянага і чорнага перцу, 1 г гваздзікоў, 2 лаўровыя лісты.

ПЕРШЫЯ СТРАВЫ

СУП З МАЛЬВАЙ. У мясным булёне ці вадзе зварыць моркву, бульбу, карэнне пятрушкі, сельдэрэю, рэпчатую цыбулю, дабавіць бланшыраванае лісце мальвы, пасераваную цыбулю, таматны соус, пасаліць, давесці да кіпення. Перад падачай на стол пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

500 мл булёну, 150 г лісця мальвы, 100 г бульбы, 30 г моркву, па 15 г карэння пятрушкі, сельдэрэю, 25 г таматнага соусу, 50 г рэпчатай цыбулі, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

СУП З МАЛЬВЫ І АГАРОДНІНЫ. У мясны булён пакласці кавалачкі ачышчаных ад лупін салёных агуркоў, кавалачкі адвараного ці смажанага мяса, вяндліны, каўбасы, сасісак, пасераваную рэпчатую цыбулю з таматным соусам і невялікую колькасць булёну, лаўровы ліст. Гатаваць на слабым агні 10 хвілін. Перад падачай на стол у талерку пакласці марынаваныя плады мальвы, скрылікі лімона, смятану, пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

500 мл булёну, 300 г мяса і іншых мясных прадуктаў, 150 г салёных агуркоў, 25 г таматнага соусу, 50 г рэпчатай цыбулі, 25 г пладоў мальвы, 25 г смятаны, 20 г лімона, 1—2 лаўровыя лісты, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

СУП ВЕРМІШЭЛЕВЫ З МАЛЬВАЙ. У мясным булёне ці вадзе зварыць бульбу, моркву, карэнне пятрушкі, рэпчатую цыбулю, дабавіць вермішэль, прапушчанае праз мясарубку лісце мальвы і варыць на слабым агні да гатовасці. Заправіць пасераванай моркваю з цыбуляй, пасаліць, давесці да кіпення. Перад падачай на стол пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

500 мл булёну, 150 г лісця мальвы, 80 г бульбы, 40 г моркву, 15 г карэння пятрушкі, 50 г рэпчатай цыбулі, 10 г алею, 20 г вермішэлі, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

БОРШЧ БЕЛАРУСКІ З МАЛЬВАЙ. У мясным булёне зварыць моркву, нашаткаваныя буракі, карэнне пятрушкі, цыбулю, бульбу, дабавіць пасераваную цыбулю, лісце мальвы, таматны соус, пасераваную на сале муку, соль, пракіпяціць. Перад падачай на стол можна пакласці ў талеркі кавалачкі сасісак, адвараного мяса, крута зварага яйка, смятану, пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

500 мл булёну, 100 г лісця мальвы, 20 г моркву, 50 г буракоў, 15 г карэння пятрушкі, 30 г бульбы, 50 г рэпчатай цыбулі, 25 г мукі, 20 г сала, 25 г таматнага соусу, 30 г сасісак, 1/2 яйка, 25 г смятаны, соль, зяленіва кропу і пятрушкі.

ДРУГІЯ СТРАВЫ

БЕФСТРОГАНАЎ З МАЛЬВАЙ. Мяса нарэзаць на невялікія кавалачкі, адбіць, нарэзаць саломкай, пасаліць, пасыпаць перцам, нарашном мальвы. Рэпчатую цыбулю падсмажыць да залацістага колеру, пакласці ў яе падрыхтаванае мяса і смажыць яшчэ 10 хвілін. Пасля пасыпаць мукой, дабавіць смятану і тушыць да гатовасці.

400 г мяса, 50 г рэпчатай цыбулі, 30 г мукі, 75 г алею, 50 г смятаны, 50 г парашку мальвы, перац, соль па смаку.

СВІНІНА, СМАЖАНАЯ З МАЛЬВАЙ. Мяса нарэзаць кавалачкамі, пасыпаць перцам, кропам, кменам, пасаліць і смажыць на добра разагрэтай патэльні з алеем ці салам. Пасля дабавіць пасераваную рэпчатую цыбулю, лісце ці парашок мальвы, смятану, таматны соус і патушыць на слабым агні да гатовасці. Перад падачай на стол пасыпаць зяленівам кропу і пятрушкі.

400 г свініны, 50 г сала, 100 г рэпчатай цыбулі, па 50 г смятаны і таматнага соусу, 150 г лісця ці 30 г парашку мальвы, соль, прыправы па смаку, зяленіва кропу і пятрушкі.

МЯСА ПА-БЕЛАРУСКУ З МАЛЬВАЙ. Ялавічыну нарэзаць на кавалачкі, адбіць, пасаліць, пасыпаць перцам, кропам, кменам, дробна нарэзанай рэпчатай цыбуляй, запаніраваць у сухарах і тушыць на слабым агні, дабаўляючы панірыку ваду і алей. За некалькі хвілін да гатовасці пакласці лісце мальвы і таматны соус.

400 г мяса, 100 г рэпчатай цыбулі, 50 г паніровачных сухароў, 50 г алею, 150 г лісця мальвы, 50 г таматнага соусу, прыправы, соль па смаку.

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ вынарыстоўваюць кветкі і лісце мальвы лясной. Яны аказваюць адхарквальнае, супрацьзапаленчае, абвалакальнае дзеянне.

НАСТОЙ ЛІСЦЯ МАЛЬВЫ. 20 г здробненага лісця настойваць у 200 мл ахалоджанай гатаванай вады 2 гадзіны, працэдзіць. Піць па 100 мл 2 разы на дзень пры бронхітах, ларынгітах, прастудзе, ахрыпласці голасу, калітах, хваробах печані, мачавога пузыра.

НАСТОЙ КВЕТАК МАЛЬВЫ. 30—40 г высушаных кветак ці лісця мальвы настойваць у 1 л кіпячо 6 гадзін. Ужываць вонкава для паласкання полаці рота і горла пры ангінах, запаленні дзёснаў, для прамывання гнойных ран, болек, апёкаў, абмарожванняў, прыкладваць кампрэсы да запаленых гемаройдальных вузлоў.

Супрацьпаказанні не выяўлены.

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ кветкі мальвы, калі яны робяцца ружовымі, але да канца яшчэ не распусціліся, з чашачкамі, без кветаножак. Адначасова можна збіраць лісце без чаранкоў у асобную тару. Сушаць на паветры ў засені або цёплых, добра праветраных памяшканнях. Пры высыханні кветкі робяцца ліловымі, цёмна фіялетавымі. Карэнне выкопваюць восенню, сушаць у засені, захоўваюць у мяшках. Лісце і кветкі захоўваюць у бляшанках, высланых паперай.

Тэрмін захоўвання лісця — 1 год, кветак — да 2 гадоў, карэння — 3 гады.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК,
Вагер САНЬКО.

З «высокай» званіцы...

Цяжка нават уявіць, колькі нашых землякоў лёс раскідаў на свеце. Але дзе б яны ні апынуліся, заўсёды пачынаюцца пошукі да сябе падобных, што называецца, братоў па крыві. Можна было б пачаць пералік з самых аддаленых зямель і тэрыторый, але за прыкладамі далёка хадзіць не варта ўжо хоць бы таму, што пад бокам знаходзіцца наша старая суседка і сяброўка ў асобе Польшчы. На адной толькі Беласточчыне праживае больш за 300 тысяч беларусаў. 7 рознапрофільных беларускіх арганізацый зарэгістраваны ў ваяводскіх судах. Так што да гэтага часу кожны жадаючы знайшоў сваё месца ў тым ці іншым аб'яднанні.

Славяне здаўна ставіліся да званоў з асаблівай павагай. Атаясамліваючы з жывымі істотамі, іх «хрысцілі» святой вадой, давалі імёны. За званамі прызнавалася таямнічая здольнасць адганяць нячыстую сілу, аберагаць ад навальніцы, усялякіх бедстваў. Пад час войнаў званы папяраджвалі аб небяспецы. Але надышоў час, і званоў не стала. Забароненая, іх музыка перастала існаваць на многія дзесяткі гадоў. І адраджаць старажытнае майстэрства прыйшлося літаральна на пустым месцы. Ствараючы новыя рэцэпты вырабу званоў, і — новую музыку.

ЗАСЛАВЕ — горад невялікі. Нават горадам называецца не заўсёды. Напэўна, таму і пакідае такое нязвыклае ўражанне хатняй утульнасці і спакою. І звон у мясцовай царкве зусім асаблівы. Не такі, як у буйных гарадах, з іх мітуснёй і вечнымі клопатамі. Хоць і вызвоньваецца вдолькава, але ўспрымаецца інакш. У вялікім горадзе ён амаль аўсёды — трывожна-суровы ў сваёй халаднаватай урачыстасці. А тут — як частка навакольнага пейзажу, сонечнай раніцы; гарманічна сугучны і з высокім мурожным валам вакол царквы, што захаваўся са старажытнасці, і з самой царквой, быццам ізаляванай ім ад усіх гарадскіх спакусаў. І вядзе звон душу да Бога — ужо не суровага суддзі; але лагоднага бацькі.

...А ў званіцы гукі поўняць столь, сцены, не пакідаючы ніводнага «неагучанага» кавалачка памяшкання. Звон затрымліваецца тут на тэрмін многа больш працяглы, чым паза сценамі царквы.

Дзіма Андарала пра званы не думаў ніколі. Але год назад прыйшоў у царкву паслушнікам. «У душы мы ўсе хрысціяне, і адны раней, другія пазней — кожны абавязкова прыходзіць да веры» — так ён лічыць. Храм Божы на той час толькі аднаўляўся, званіца стаяла пустая. Але мясцовы настаяцель, айцец Мікалай, ужо выпісаў званы з Архангельска і прапанаваў Дзіму заняць месца званара.

— Прыехалі людзі з Архангельска, падзівіліся на нашу званіцу, бо вельмі вялікая. Навесілі званы, паказалі, што да чаго, — успамінае Дзіма. — І назаўтра я падняўся званіць да службы самастойна. Падышоў да самага вялікага звана, пацягнуў за вяроўку... Ну, думаю, бывай, слых. І служаўся — што ж людзі падумаюць? Айцец Мікалай адрэкамендаваў ім мяне ўжо як новага званара. Атрымаецца блага — яшчэ выгнаць, што ўзялі абыякага...

Але на той раз атрымалася ўсё як след. Колькі гадоў не чулі ў Заслаўі званоў! А хлопец потым не раз падымаўся на званіцу. Не з цікаўнасці і не дзеля забавы. Трэніраваўся. У будзённыя дні, па-за службай — каб рабіць калі-небудзь сапраўдны, кананічны звон. Дарэчы, не вельмі камплексуючы, што «рэпетыцыі» чуваць надалёка. Бо ўпэўнены: «Калі чалавек шчыра веруючы, рэгулярна наведвае храм, ён заўсёды адрозніць сапраўдны звон ад такога. Раней людзі нават толькі па звоне маглі вызначыць, якая частка службы ідзе».

Але цяпер, бадай, не кожны пахваліцца, што здольны на гэта. За доўгія гады людзі вельмі ўжо далёка адышлі ад царквы.

Дзіма не прызнае за звонам ніякага іншага значэння, акрамя як «радасці для душы». Нельга, на яго думку, успрымаць духоўнае з практычнага пункту гледжання. Таму і да павер'я, што звон адганяе злосныя сілы, ставіцца вельмі скептычна. Прачытаўшы неяк у газеце пра адкрыццё фізікаў, што звон забівае бактэрыі, таксама не прыняў гэта на веру. Бо ўпэўнены: звон трэба слухаць...

Ірына ЗАВАДСКАЯ.

БАС— рэальная сіла

ЧЫМ ЖЫВУЦЬ БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

Сёння хацелася б расказаць пра самы, бадай, аўтарытэтны і дзейсны на гэты момант сярод усіх вядомых беларускіх арганізацый орган беларускіх студэнтаў — БАС на чале з яго прэзідэнтам пані Барбарай Кучынскай.

Наогул, пра Беларускае аб'яднанне студэнтаў у Польшчы трэба пачынаць гаворку, азіраючыся на вядомыя падзеі дзесяцігадовай даўнасці, калі заявіла аб сабе «Салідарнасць» і наогул мяняўся ўвесь палітычны ўклад. Менавіта ў гэты час у Варшаве з'явілася моцная група беларускіх студэнтаў, якая ўпершыню спрабавала зарэгістраваць свой рух пад сённяшняй назвай. Афіцыяльныя ўлады катэгарычна адмовілі студэнтам, матывуючы гэта тым, што, маўляў, ёсць нейкія польскія арганізацыі, пры якіх можна стварыць любыя субарганізацыі і дзейнічаць супольна з імі, г. зн., ні пра якія фарміраванні студэнтаў нацыянальных меншасцей не магло быць і гаворкі. Але ўсе гэтыя перашкоды мала цікавілі людзей, якія былі рашуча настроены ў сваіх мэтах. Праўда, у той час так і не ўдалося прабіць сцяну тагачаснай абыякавасці, і толькі ў лістападзе 1988 года БАС быў зарэгістраваны ваяводскім судом у Варшаве. Там жа знаходзіліся і першая штаб-кватэра, і Галоўная рада, і толькі апошні з'езд беларускіх студэнтаў, які адбыўся ў гэтым годзе, выявіў, што, паколькі з цягам часу ўсё жыццё беларускай меншасці і яе дзейнасць перанеслася на Беласточчыну, то лагічна зрабіць цэнтрам дзейнасці БАСа Беласток. Да таго ж амаль уся Галоўная рада складаецца з ліку студэнтаў беластоцкіх навучальных устаноў — універсітэта, а таксама медыцынскай і політэхнічнай акадэмій. І недзе ў пачатку вясны ўсе паперы аб рэгістрацыі перакачавалі ў ваяводскі суд Беластока разам з Галоўнай радай і штаб-кватэрай. Але гэта толькі фармальнасці. Метады і сутнасць работы ад гэтага не змяніліся. Крыху больш падрабязна пра гэта — у адказе пані Барбары Кучынскай, трэцяга па ліку прэзідэнта Беларускага аб'яднання студэнтаў.

— Наогул, наша мэта — поўнасцю адключыцца ад палітычнай дзейнасці і жыць толькі студэнцкім жыццём. Нават у статуце БАСа не ставяцца ніякія палітычныя мэты. Сярод нашых задач — пашырэнне ведаў пра Беларусь і студэнцкая культурная дзейнасць; арганізацыя маладзёжных мерапрыемстваў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці беларускай меншасці. Але сёння ад палітыкі ў любым выпадку нельга пазбавіцца, асабліва калі гаворка ідзе пра студэнтаў, якія заўсёды неслі нейкую радыкальную думку. У агульным сэнсе мы і зараз удзельнічаем у палітычным руху. Калі вырашаюцца нейкія важныя для нашай меншасці пытанні, заключаюцца дагаворы, пагадненні і г. д. з беларускім бокам, БАС абавязковы ўдзельнік такіх мерапрыемстваў.

Што датычыцца агульнай колькасці членаў БАСа, то, па словах Барбары, такая статыстыка вялася толькі на пачатку існавання аб'яднання, калі гурткі ствараліся амаль пры кожнай вучэльні. На сённяшні ж момант мэтай падлічыць усіх пагалоўна і нагрузіць кожнага работай ніхто не задаецца, бо ва ўсіх арганізацыях ёсць людзі, якія працуюць за семярых, і тыя, якія не ўдараць палец аб палец. Напрыклад, на традыцыйнае свята беларускіх студэнтаў, над рэалізацыяй якога працуюць 20 чалавек, прыходзяць пагуляць 500 членаў БАСа. Гэта і ёсць рэальны расклад пасіўных і актыўных удзельнікаў.

У адказе на пытанне, ці патрэбна ўсё-такі апалячыўшымся беларусам, якія ў большасці сваёй нарадзіліся і выраслі на тэрыторыі Польшчы, Беларушчына, пані Барбара Кучынская катэгарычная. Калі б гэта не было патрэбна, то не існавала б ні БАСа, ні фестывалю «Басовішча», ніводнай з беларускіх арганізацый са сваімі газетамі. Але калі ўсё гэта да цяперашняга часу існуе, то, відаць, ёсць у тым нейкая патрэба. Людзі, хай сабе падсвядома, але ўсё-такі адчуваюць розніцу паміж сабой і палякамі. Вядома, асіміляцыя непазбежная. І ў развітых заходніх краінах яна наступае яшчэ хутчэй.

— Пачынаючы з 1945 года,— канстатуе пані Кучынская, — так званая народная ўлада не мела нічога агульнага з паняццем справядлівай улады. Абсалютная большасць школ з беларускай мовай навучання была ліквідавана. У 50-х гадах са шматлікіх беларускіх гуртоў засталіся толькі «Ніва» і БГКТ (Беларускае грамадска-культурнае таварыства), але і яны былі пад кантролем МУС. Любая беларуская дзейнасць на тэрыторыі Польшчы аб'яўлялася паза законам. Але ж кожны чалавек, дзе б ён ні жыў, мае права адчуваць сябе тым, кім ён ёсць. Я не полька, і проста так не магу сябе прымусіць ёй быць.

Дзякуй Богу, сёння ўжо нікому не трэба хавацца ў падполлі толькі таму, што ён беларус. Афіцыяльна зарэгістраваны і дзейнічае ўсё той жа БГКТ. (На думку пані Барбары, — гэта арганізацыя без будучыні. Састарэлыя «бэгэкатэўцы» ўжо даўно не выходзяць у народ і не прымаюць ніякіх прагрэсіўных рашэнняў.) Ёсць і першая беларуская палітычная партыя — Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. «Белая вежа» — суполка беларускіх пісьменнікаў і паэтаў у Польшчы. Маладзёжная арганізацыя «Зэд бэм», што аб'яднала ў асноўным школьнікаў і ліцэістаў, накіравала выходзіць да сваіх адгнагодкаў на тэрыторыі Беларусі.

Што датычыцца БАСа, то зараз польскія афіцыяльныя колы не перашкаджаюць яго дзейнасці, хаця аж да 1988 года гэта была поўнасцю падпольная арганізацыя. Але дзеля справядлівасці трэба сказаць, што няма з боку ўладаў і ніякай дапамогі. БАС кінуты на волю лёсу. «Мы працуем самі на сябе, бо іншай магчымасці выжыць сёння няма», — сказаў неяк Ян Максімюк, член Галоўнай рады БАСа, рэдактар «Нівы», арганізатар музычнага фестывалю «Басовішча-92».

— І ўсё-такі, ці ёсць будучыня ў БАСа? — пытаюся ў Барбары.

— Я заўсёды была аптымісткай. І тыя паўгода, калі я спрабую быць прэзідэнтам (калі так можна сказаць), усяляюць неблагія надзеі. Наогул, каб прадоўжыць гэтую справу, не трэба вялікая армія выканаўцаў, хопіць некалькіх зацікаўленых аднадумцаў.

Не баіцца прэзідэнт і даволі частай змены кіраўніцтва ў самім аб'яднанні студэнтаў.

— Каб гэта была вельмі сур'ёзная арганізацыя, то, вядома, частая змена кіраўніцтва наўрад ці пазітыўна адбілася б на ўсёй дзейнасці аб'яднання. Але ж гэта проста студэнты — нармальныя, як і ўсюды ў свеце. Увогуле ж уся праца тут абапіраецца не столькі па прэзідэнта, колькі на каардынацыйны цэнтр, г. зн., групу людзей. Прэзідэнт — хутчэй за ўсё звяно, якое крыху карэкціруе дзейнасць сваіх аднадумцаў. А наогул улада не павінна доўга заседжвацца на адным месцы, каб у рэшце рэшт не зарасці кансерватыўным мохам. Новыя ідэі павінны хутка змяняцца.

Застаецца толькі дадаць, што найвялікшым мерапрыемствам, якое аўтаматычна ўзнесла аўтарытэт БАСа на недасягальную вышыню, стаў музычны фестываль Маладой Беларусі «Басовішча». Па словах аднаго з арганізатараў фестывалю, «гэта— найбольшы наш гонар, мерапрыемства, якое бярэ найбольш працы, найбольш грошай, але якое разам з тым найбольш цешыць, паколькі яно жыве ўжо трэці год».

На здымку: прэзідэнт беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы пані **Барбара КУЧЫНСКАЯ.**

Ігар КАРНЕЙ.
Беласток — Мінск.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

13 жніўня

Беларускае тэлебачанне

8.30 Раніца рэспублікі.
8.45. «Маналог». Фільм-канцэрт.
9.15. «Другарадныя ролі». Маст. фільм (Куба).
11.05. «Адвечнае вандраванне». Драматург, рэжысёр, акцёр Уладзіслаў Галубок.
16.30. Навіны.
16.35 «Аліса ў краіне цудаў». Фільмы 1—3-ці, «Следства вядуць Калабкі». Мультфільмы.
17.25. «Разам весела ісці...», «Сонечны зайчык». Фільмы-канцэрты.
18.00 Доўгі шлях ад зерня да піраг. Перадача з Віцебска.
18.20. Дак. фільм «Болдзінскае прыцягненне».
19.00 Абласныя навіны (Гродна).
19.10 Зачытайце маё пісьмо...
19.15 Тры кіты. Мастацка-публіцыстычная праграма.
19.55. Студыя «Мэта». Купалаўскі сад.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Крок-дайджэст».
23.00. НІКа.

І канал. Астанкіна

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. «Чаканне». Мультфільм.
9.55. Маст. фільм «Жаданне спяваць». 3-я серыя.
11.00. Навіны з (сурдаперакладам).
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Мультфільмы «Чароўная птушка», «Пад адным дахам», «Казкі-небыліцы дзеда Ягора».
15.00 «Беноні і Роза». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.00. Дзіцячая спартыўная праграма.
16.20. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Выніні XXV летніх Алімпійскіх гульняў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Жаданне спяваць». 3-я серыя.
21.50. «Гонар маю... Разведка». Перадача 2-я.
22.20. «Двайная ігра». Музычная праграма. У перапынку — Навіны.
24.00. «Беноні і Роза». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

9.20. Вольны час. «Кветкі ў дома».
9.35. Праграма «Ключ».
9.50. Фальклор. «Павітуха».
10.10. «Святлівы свет». Мастак Соф'я Халецкая.
10.40. Тэатральны раз'езд. «Дзве прэм'еры».
11.50. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Сігнал.
15.15. Мульці-пульці.
15.45. Пілігрым.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00 Бізнес і палітыка.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Крымінальныя весткі.
19.45. «ЗША — СССР: вялікая гульня». (Францыя — Іспанія). Фільм 3-ці Поўнач стагоддзя».
20.45. Благавешчанне.
21.00. «Ціхі дом».
22.00. Весткі.
22.20. «Ціхі дом» (працяг)

14 жніўня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Волга-Волга». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Голас». Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў.
17.25. «Мук-скарыход», «Фэт Фрумас і Сонца», «На парог мой села казка». Мультфільмы.
18.00. Навукова-папулярны фільм «Сайгані».
18.20. Абласныя навіны (Магілёў).
18.30. Футбол. Міжнародная таварыская сустрэча. Жанчыны. Зборная Беларусі — зборная Латвіі.
20.10. Культурызм — спорт для ўсіх.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Волга-Волга». Маст. фільм.
23.15. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.00. «Дажджлівая гісторыя». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. Дак. фільмы «Міранде», «Сакера вострая».
9.35. Мультфільм.
9.45. Маст. фільм «Жаданне спяваць». 4-я серыя.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
13.15. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
14.00 Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Падарунак меламану». Музычная гасцёўня Ірыны Архіпавай. Перадача 1-я.
14.55. «Беноні і Роза». 3-я серыя.
15.50. Фільм — даецям. «Эгрэта са слановай косці» (Румынія).
17.00. Навіны
17.25. Чалавек і закон.
17.55. Фільм для дзяцей «Прыгоды чорнага Прыгажуна». 5-я серыя «Канакрады».
18.20. ТБ-«Ніва». «Хто з намі?»
18.40. «Велікан, які марыў іграць на скрыпцы». Мультфільм.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Жаданне спяваць». 4-я серыя.
21.55. Матадор.
23.20. Адпачывай.
23.35. Хіт-канвеер. У перапынку — Навіны.
0.35. «Беноні і Роза». 3-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Студыя «Нотабене».
8.35. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.50. Тэлевізійны тэатр Расіі. А. Касцінскі. «Клетка».
10.20. Тэма з варыяцыямі. «Калядная серэнада».
11.05. Мульці-пульці.
11.15. «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлеміржа.
15.30. Мульці-пульці.
15.50. «Індыя. Пад знакам «О».
16.30. Там-там навіны.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «І раскрыецца ў песні душа».
17.45. Панове-таварышы.
18.00. Так і жывём.
18.45. Крымінальныя паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Вялікае кола.
19.50. Антракт. «Настасся».
20.00. Хрона. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.30. «ЗША—СССР: вялікая гульня» (Францыя — Іспанія). Фільм 4-ы «Пачатак адліцтва».
21.30. «Прапала сумленне», «Бервяно» Мультфільмы для дарослых.
22.00. Весткі.
22.20. «Жонка пакінула». Маст. фільм.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 159.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12